Пролетарыі всех стран, соединяйтесь!

УМОВЫ ПАДПІСКІ: На 1 м-ц—90 к.; на 3 м-цы—2 р. 60 к. на 6 м-цаў—5 р.; на 1 год—9 р. 75 к. Зьмена адрасу: мясцовага—10 к., іншагародняга—20 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок нонпарэл 50 к. Для Маскоўскіх і Пасярох чокету у два [illegible] Пры ежэдзённым друк[illegible] на агодзе. Этодна пяст. СНК ад 10 ве[illegible] бярэцца зьверх зарыфу 10 пр[illegible]

Падпіска і абвесткі прымаюцца: У Гал. Канторы газ. „Зьвязда"—г. Менск, Савецкая 63, трэці паверх, ад 9 гадз. раніцы да 3-х гадз. дня. У акруговых гарадох—у акр. Вел. Дзярж. Выдавецтва і па усіх пашт.-тэл. канторах.

РЭДАКЦЫЯ—Г. МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63.

# ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральн. Камітэту камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Мен. АККП(б)Б.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎН. КАНТОРА. 1) Рэдактар прымае ад 11—1 гадз. дня: тэлефон № 10-74. 2) Сакратар рэдакцыі—ад 12 да 2-ое гадзіны дня, тэл. № 6-19. 3) Начны рэдактар (друкарня) ад 6 гадз. вич. тэл. № 6-42. Кіраўн. Гал. Канторай Канторай абвестак і падпіскі ) тэл. № 731.

ПЯТНІЦА, 3 ЛЮТАГА 1928 г.

№ 29 (2836)

Кошт асобнага нумару ўсходзіць 5 кап.

Год выданьня дванаццаты.

## Падрыхтоўка да сьвяткаваньня юбілею Чырвонай арміі

**„Напружаныя міжнародныя абставіны СССР і пагроза ваеннага нападу патрабуюць, асабліва ва ўмовах прыгранічнасьці БССР, далейшае неаслабнае ўвагі Чырвонай арміі, культурнай і матар'яльнай дапамогі ёй, далейшаму значнаму ўзмацненьню работы па ўзьняцьці абароназдольнасьці краіны".**

**(XI зьезд КП(б)Б. Рэзалюцыя па справаздачы ЦК КП(б)Б).**

Дзесяцігадовы юбілей Чырвонае арміі зьяўляецца выдатнай падзеяй у нашым жыцьці ня толькі ў моц асобнай і выключнай ролі нашае Чырвонае арміі ў гісторыі першых год пралетарскае рэвалюцыі. Гэты юбілей набывае асобнае значэньне ў моц таго міжнароднага становішча нашае краіны, якое мы маем да гэтага часу.

Вось чаму мы абавязаны ня толькі з радасьцю адзначыць гэту гістарычную і слаўную дату, але і паглядзець, што робіцца, што зроблена ў сэнсе акружэньня часьцей Чырвонае арміі тэю увагаю і клопатам, аб якіх гаварылася і гаворыцца ў шматлікіх пастановах нашых кіруючых органаў.

Мы павінны паглядзець таксама, наколькі энэргічна разьвіваецца работа па палепшаньні абароназдольнасьці краіны, наколькі ўцягнута ў гэту справу актыўнасьць мас, наколькі гэта актыўнасьць ахоплівае адпаведнымі арганізацыямі, якія тут у нас дасягненьні і недахваты. Падрыхтоўка да сьвяткаваньня, якая зараз вядзецца, і само сьвяткаваньне,—павінны адказаць на гэтыя пытаньні.

Тыя няпоўныя пакуль што весткі аб падрыхтоўцы да юбілею Чырвонай арміі, якія мы маем зараз, гавораць, што ў агульным і цэлым гэта работа праводзіцца.

Зра умела, і тут, як кажуць,—не без граха. Узяць, хоць-бы такі, напрыклад, адзначаны палітуправаю БВА, факт: аказваецца, некаторыя нашы газэты да гэтага часу вое знайшлі магчымым даць на сваіх старонках ні аднаго радка аб падрыхтоўцы юбілею Чырвонай арміі.

З другога боку, адзначаецца добра пастаўленая падрыхтоўка сьвяткаваньня ў Бабруйскім «Камуністе». Наогул, весткі з Бабруйскае акругі гавораць аб досыць значнай рабоце, якая разгорнута там па падрыхтоўцы юбілею.

Калі-ж мы зьвернемся да работы па ваянізацыі, па ўзмацненьні абароназдольнасьці нашае краіны, шляхам канцэнтрацыі вакол гэтых пытаньняў увагі і актыўнасьці рабоча-сялянскіх мас, дык тут малюнак вырысоўваецца вельмі сваласаблівы.

Актыўнасьць мас вакол гэтых пытаньняў ёсьць, як гэта і было нядаўна канстатавана ЦК КП(б)Б, але кіраўніцтва гэтай актыўнасьцю з боку адпаведных арганізацый вельмі і вельмі невыстарчальнае.

Вось чаму гэты вельмі невялікі прамежак часу, што застаўся да сьвята, неабходна максымальна выкарыстаць для ажыўленьня работы арганізацый Асоавіяхіму зьверху данізу.

Побач з праверкай і зьнішчэньнем тых дэфэктаў, якія ёсьць у сэнсе ажыцьцяўленьня дырэктыў вышэйшых органаў аб дапамозе Чырвонай арміі (ільготы дэмабілізаваным, сем'ям чырвонаармейцаў, прадастаўленьне работы дэмабілізаванаму камскладу і г. д.), павінна быць разгорнута і ажыўлена работа нашых грамадзкіх арганізацый па ваянізацыі мас, павінна быць узмоцнена і работа шэфаў і сатарыстваў.

Партыйныя арганізацыі на месцах пытаньням падрыхтоўкі юбілею Чырвонай арміі ў гэтым шырокім сэнсе павінны зьвярнуць адпаведную увагу.

Да сьвята застаецца ўсяго тры тыдні—тэрмін вельмі кароткі. Трэба пасьпяшыцца.

## Аб пэскарэньні і спрашчэньні земляўпарадкаваньня

### (У парадку абгаварэньня)

Ня трэба даказваць шырокім колам сялянства аб тай ролі, якую павінна адыграць земляўпарадкаваньне ў справе разьвіцьця гаспадаркі, далейшай яе інтэнсыфікацыі, павышэньня таварнай яе часьці, стварэньня грунту для вытворчага каапераваньня і калектывізацыі. Без земляўпарадкаваньня немыслімы ніякія сур'ёзныя гаспазарчыя палепшаньні, немыслімы скарыстаньне машын, павялічэньне прадукцыйнасьці працы і г. д.

Вось таму XV партыйны зьезд побач з цэлым радам іншых вельмі важных дырэктыў у галіне сельскае гаспадаркі пастанавіў паскорыць земляўпарадкаваньне.

Якія шляхі і сродкі для ажыцьцяўленьня гэтае мэты ёсьць у нас. Вось яны: павялічэньне кадраў каморнікаў, шляхам падрыхтоўкі іх праз нашы навуковыя ўстановы; павялічэньне грашовых асыгнаваньняў на гэту работу; стварэньне спэцыяльных фондаў для ўпарадкаваньня біднейшай часткі вёскі і г. д. Але вялікі непачаты край работы ў справе рацыяналізацыі земляўпарадкаваўчых работ паўстае ва ўсю шырыню перад зямельнымі органамі. Наш земляўпарадкаваўчы працэс, нажаль, захаваў у сабе шмат бюракратызму і на гэтым этапе нашага гаспадарчага разьвіцьця зьяўляецца адным з вялікіх тормазаў у справе паскарэньня земляўпарадкаваньня. Аб гэтым ведаюць партыйныя працаўнікі, спэцыялісты, аб гэтым ведае кожны селянін.

У друку гаварылася ня раз аб гэтым, таму цяпер ня трэба прыводзіць аргументаў у пацьвярджэньне сказанага.

Наркамземам па адмоўленьне вялася і вядзецца праца ў гэтым напрамку. У выніку ўсебаковых абмеркаваньняў намячаецца наступны парадак земляўпарадкаваўчага працэсу.

1. Насельніцтва ўзбуджае хадайніцтва аб земляўпарадкаваньні перад РВК, які складае плян работ па раёне і ўстанаўляе чарговасьць выкананьня спраў; раней хадайніцтва аб земляўпарадкаваньні ўзбуджалася перад АКРЗА.

2. Падрыхтоўка да земляўпарадкаваньня, як паасобная стадыя працэсу, зьнішчаецца.

3. Па складаньні пляну земляўпарадкаваўчых работ па акрузе, па месца камандыруюцца тэхнікі і каморнікі для выкананьня справы.

4. Спрэчкі і скаргі, якія ўзьнікаюць у часе разгляду справы, вырашаюцца там-жа на месцы камісіяй, якая складаецца з каморніка, прадстаўніка сельсавету і старшыні мясцовага камітэту сялянскае ўзаемадапамогі.

На грунце спрэчак, якія вырашаюцца, складаецца земляўпарадкаваўчы праект; ніякія скаргі, зьвязаныя з складаньнем праекту земляўпарадкаваньня да разгляду ў вямельных камісіях, да складаньня праекту і яго прад'яўленьня насельніцтву—не разглядаюцца. Прадстаўлены праект, у выпадку заўважаных спрэчак, накіроўваецца на вырашэньне РЗК, якая ў даным выпадку зьяўляецца другой інстанцыяй і апошняй. Рашэньне раённай зямельнай камісіі (дарэчы сказаць, склад якой маркуецца пашырыць шляхам увядзеньня каморніка з рэвізораў, агранома і судзьдзі) прыводзіцца ў выкананьне.

Вось кароткі праект таго, што маркуецца зрабіць і будзе прадметам абгаварэньня пашыранай калегіі Наркамзему.

Прапанаваны праект дасьць магчымасьць цягнуць у непасрэдную работу органы мясцовай савецкай улады, якія да гэтага часу па сутнасьці далёка стаяць ад непасрэднага ўдзелу ў рабоце па земляўпарадкаваньні. З другога боку—гэта дасьць магчымасьць зрабіць адказным за даручаную работу каморніка. Закончаная земляўпарадкаваўчая справа пры прапанаваным праекце ня будзе плаваць па інстанцыях зямельных камісій, а калі нават і будуць скаргі, дык усё-ж пасьля пастановы раённай зямельнай камісіі яна прыводзіцца ў выкананьне.

## У Заходняй Беларусі

### ПРАЦЭС 133

*ВІЛЬНЯ, 2. 7-га лютага гэтага году ў Беластоку пачнецца разгляд справы 133 асоб, абвінавачаных па арт. 51 і 102 Крым. К. у сувязі з артыкулам 100, ч. I Крым. К., г. зн., у прыналежнасьці да камуністычнае партыі Заходняй Беларусі. Акт абвінавачаньня абыймае 500 старонак. Падсудныя абвінавачаюцца ў арганізацыі ЦК кампартыі Заходняй Беларусі, Беластоцкага акр. кам. КПЗБ, раённых і падраённых камітэтаў і некалькіх ячэек. З боку абвінавачаньня на дагнаньне выклікана 186 сьведак, між імі знаходзіцца галоўны сьведка—правакатар гэтага працэсу Міхась Гурын, працаўнік паўлюкевічаўскага «Беларускага дня». Двое з абвінавачаных—Якуб Чэрнік і Станіслаў Мэртэнс—з студзеня г. г. абменены з СССР на польскіх шпіёнаў.*

### ПАЛІЦЫЯ ПРАВОДЗІЦЬ ВЫБАРЫ

**ВІЛЬНЯ, 2.** Паліцыя канфіскавала ў в. Каранёва, Валейскага пав., перадвыбарную літаратуру беларускага выбарчага камітэту і, апроч таго, склала пратакол на селяніна, у хаце якога быў перадвыбарчы сход.

### КАНФІСКАЦЫЯ „СЯЛЯНСКАЙ НІВЫ"

**ВІЛЬНЯ, 2.** З 9 нумароў беларускае газэты „Сялянская Ніва" (орган беларускіх нацыяналістых). што выданы былі ў студзені г. г., паліцыя канфіскавала чатыры нумары.

### ПРАВАЛ „ВЫЗВАЛЕНЬНЯ" Ў СТОЎБЦАХ

**ВІЛЬНЯ, 2.** Агітатары з „Вызваленьня" (кулацкая партыя) прыехалі ў Стоўбцы, каб праводзіць перадвыбарны сход. Аднак ніхто з сялян на сход не зьявіўся і сход ня ўдаўся.

### НЯ ШЧАСЬЦІЦЬ І Р.Н.А.

**ВІЛЬНЯ, 2.** Расійскае народнае аб'яднаньне (Р. Н. А.) у апошнія часыладзіць перадвыбарныя сходы ў Заходняй Беларусі. Аднак сяляне на слухаюць чорнасоценных агітатараў з РНА. Так, у Баранавічах і Лунінцы сходы, скліканыя РНА, скончыліся правалам для іх арганізатараў.

## Пахвалінскі аб крывавым тэрары ў Кантоне

МАСКВА, 2. Прыбыўшы ў Маскву генэральны консул СССР у Кантоне т. Пахвалінскі ў гутарцы з супрацоўнікам ТАСС аб падзеях у Кантоне ў сьнежні месяцы паведаміў наступнае:

«Задоўга да камуністычнага перавароту, у Кантоне ўжо адчувалася напружанасьць, выкліканая барацьбой паміж генэралам Чжан Фагуем, які называў сябе левым гамінданаўцам, і рэакцыйнай гуансійскай клікай, што вяла наступленьне на Кантон. Усе намаганьні Чан Фа-гуя былі накіраваны на тое, каб ліквідаваць гэтае наступленьне. Урад Чан Фа-гуя ня ўнёс ніякіх зьмен у цяжкае становішча кантонскага пралетарыяту і па сутнасьці гэта ўлада нічым не адрозьнівалася ад дыктатуры рэакцыянэра Лі Ці-сіна.

Гэтае бязвыхаднае становішча кантонскіх рабочых змусіла іх выступіць са зброяй у руках уначы на 11-га сьнежня на вуліцы Кантону і захапіць у свае рукі ўладу. Самы пераварот адбыўся параўнаўча лёгка, дзякуючы ўходу на фронт рэгулярных войск. 11-га сьнежня ўдзень былі захвачаны ўсе ўрадавыя і вайсковыя ўстановы, усе штабы; у горадзе пачала арганізоўвацца новая ўлада, якую з радасьцю сустрэлі кантонскія рабочыя. Арганізаваўся кантонскі савет рабочых дэпутатаў і кантонскі савецкі ўрад—Саўнарком, у які ўвайшлі самыя відныя працаўнікі кітайскай камуністычнай партыі.

Тав. ПАХВАЛІНСКІ.

Уся ўвага кантонскага савецкага ўраду была накіравана на абарону гораду. Прыспешана абучаліся атрады Чырвонай гвардыі і сфармаваныя атрады Чырвонай арміі. На гарадзкіх пляцох босыя і абарваныя рабочыя на працягу 2-3 гадзін абучаліся стральбе і заражжа адпраўляліся на барацьбу з ворагам, які расьсеяўся па ўсім горадзе. Чырвонаармейцы і чырвонагвардзейцы мелі на шыі чырвоныя гальштукі. Паасобныя атрады мелі чырвоныя сьцягі з сярпом і молатам. Барацьба была няроўнаю. З аднаго боку—мала абучаныя рабочыя атрады, а з другога—наступаючыя на Кантон з двух флянгаў рэгулярныя часьці Лі Фу-ліна.

Уноч на 13-га сьнежня гэтым часьцям удалося ўварвацца ў горад і пачаўся самы жорсткі тэрар, нябачаны нават у гісторыі кітайскай рэвалюцыі. Хоць асноўнаму аспродзьдзю Чырвонай арміі, а таксама і кантонскаму савецкаму ўраду ўдалося выйсьці з гораду, усё-ж у горадзе засталося яшчэ шмат рабочых, на якіх і напалі банды Лі Фу-ліна.

Рабочых расстрэльвалі дзесяткамі і сотнямі чалавек. Ім у гэтым дапамагалі арганізаваныя белагвардзейскія атрады кантонскай буржуазіі. З вакон консульства было відаць, як катавалі схопленых на вуліцах рабочых і як іх расстрэльвалі. Толькі на працягу першага тыдню было расстрэлена ў горадзе звыш 2.000 рабочых. Чужаземцы, якія жылі ў прыгарадах Кантону, яшчэ 11-га сьнежня былі пераведзены ў Шамін (чужаземная канцэсія), і доступ на выспу Шамін быў закрыты».

### ЗБРОЯ ЧЖАНУ ПРЫВЕЗЕНА

ПЕКІН, 1. Паводле вестак агэнцтва „Го-Вэнь", чэхаславацкі параход „Прага" з грузам амуніцыі і зброі для Чжан Цзо-ліна прыбыў у Цынвандао (порт на паўночным усходзе правінцыі Чжылі). Параход экстрана выгружаны.

### ЗА АДЗІНЫ ФРОНТ МІЛІТАРЫСТЫХ СУПРОЦЬ РЭВАЛЮЦЫІ

ПЕКІН, 1. Як паведамляе друк, генэрал Бай Цзун-чы апублікаваў тэлеграму-абежнік, у якой выказваецца за мір паміж паўднёвым і паўночным Кітаем і дамагаецца скліку „народнай канфэрэнцыі" для ўрэгуляваньня спрэчных пытаньняў.

### НОВАЕ ПАРАЖЭНЬНЕ ПАЎНОЧЦАЎ

ШАНХАЙ, 2. Войска Фын Юй-сяна пасьля месячнай аблогі заняло горад Цаочжоу (у Шандунскай правінцыі, на мяжы чжылійска шандунскай граніцы). Пры гэтым войска Фын Юй-сяна ўзяло ў палон 4.000 салдат шандунскага войска і захапіла 20 буйных гармат.

## У НЯМЕЧЧЫНЕ

### „ПАЛІТЫКА ЛЁКАРНО ДАЕ ТОЛЬКІ ГЛЫБОКАЕ РАСЧАРАВАНЬНЕ"

БЭРЛІН, 1. У часе спрэчак па бюджэце міністэрства замежных спраў у рэйхстазе дэпутат народнае партыі і бліжэйшы супрацоўнік Штрэзэмана Рэйнбабен сказаў: „Урад Пуанкарэ заўсёды імкнуўся да відавочнай мэты: згадзіцца на эвакуацыю Рэйнскай вобласьці толькі ў абмен на пэўныя фінансавыя выгады. Да гэтага часу балянс гэтак званае палітыкі Лёкарно дае толькі глыбокае расчараваньне. Ліга Нацый ці так званае сусьветнае сумленьне на верне нам свабоды і моцы. Мы павінны за гэта весьці барацьбу. Народная партыя рыхтуецца да ўпартае барацьбы. Будучыня Нямеччыны ўяўляецца ў наступным выглядзе: на захадзе—свабода на Рэйне і ў Саарскай краіне, на ўсходзе—зьмена немагчымых граніц, трывалыя адносіны паміж Польшчаю і намі, у далейшым далучэньне Аўстрыі. Да гэтага трэба дадаць палітычнае і вайсковае раўнаўпраўе Нямеччыны".

### РОСПУСК САЮЗУ ЧЫРВОНЫХ ФРАНТАВІКОЎ У ФАЛЬКЭНБЭРГУ

БЭРЛІН, 1. Прускі міністэр унутраных спраў сацыял-дамакрат Грэзэнскі распусьціў са эгоды агульна-нямецкага ўраду мясцовую арганізацыю саюзу чырвоных франтавікоў і юнацкую арганізацыю франтавікоў у Фалькэнбэргу па тай прычыне, што гэты арганізацыі чырвоных франтавікоў „супярэчаць пастановам мірнага дагавору".

### С.-Д. ПАДАРАВАЛІ МАГНАТУ 200 МЛН. МАРАК

БЭРЛІН, 1. Цюрынгскі ляндаг большасьцю галасоў усіх партый супроць камуністых ухваліў законапраект аб выплаце кампэнсацыі ў 200 мільёнаў марак былому княжыцкаму дому гэрцагства Гота за канфіскаваную маемасьць. Сацыялдэмакраты ад галасаваньня ўстрымаліся. Калі-б сацыял-дэмакраты падтрымалі камуністых, дык законапраект праваліўся-б.

### Працэс югаслаўскіх камуністых

**ВЕНА, 30** Як паведамляюць з Белграду, у пачатку лютага ў белградзкім судзе будзе пачата слуханьне справы генэральнага сакратара незалежных прафсаюзаў Юга-Славіі Лазы Стэфановіча, камуністых Сімы Марковіча, Радэміра Вуйовіча і інш. Сярод абвінавачаных ёсьць некалькі нямоўнадзетных. Паводле вестак белагвардзейскай газэты „Навіні", абвінавачаныя абвяшчалі галадоўку ў знак пратэсту супроць зацягваньня сьледзтва. Галадоўка працягвалася два дні і, як відаць, яна прымусіла ўраду вызначыць дзень працэсу.

## Праграма „рабочага" ўраду Нарвэгіі

СТАКГОЛЬМ, 1. Новы нарвэскі „рабочы" ўрад агаласіў у стортынгу (парлямант) сваю праграму. Важнейшыя пункты праграмы наступныя: барацьба ў беспрацоўем, адмена закону „аб ахове свабоды працы" (які мае на мэце абарону штрайкбрэхераў), паляпшэньне становішча беднага сялянства і рыбакоў, правядзеньне хлебнай манаполіі, адмена хлебных мытаў і адмена закону аб прымусовым буйным землеробстве.

Урад маркуе ўнесьці ў парлямант праект новага закону аб сям'і, законапраект аб паляпшэньні ўмоў працы і аплаты дзяржаўных служачых і аб адмене ўкваленых пядаўна стортынгам рэакцыйных школьных законаў. Для пакрыцьця выдаткаў, зьвязаных з ажыцьцяўленьнем праграмы, урад маркуе ўнесьці праект зьмяненьня падаткавай сыстэмы ў бок павялічэньня падаткаў на заможныя клясы. Урад маркуе скараціць вайсковы бюджэт і, у прыватнасьці, адмяніць вайсковыя манэўры, прызначаныя на 1928 год. Адначасова ўрад заявіў аб сваім намеры „падрыхтоўваць поўнае разбраеньне".

Буржуазны друк зазнае праграму новага ўраду „фінансавым дакумэнтам". Камуністычны друк характарызуе праграму, як ліберальна-дэмакратычную. Друк удзяляе шмат увагі абраньню намесьніка старшыні стортынга Ліберала Мовінкеля (пост намесьніка старшыні стортынга займаў раней прэмэр новага ўраду Хорнсруд). Мовінкель абраны большасьцю 78 галасоў супроць 65, падаўленых за кандыдата рабочай партыі. Гэта лічыць знакі галасаваньня варажэньнем ураду.

## РАБОЧЫ РУХ ЗА ГРАНІЦАЮ

### ПРАВАЛ „АПАЛІТЫЧНАГА" САЮЗУ Ў АНГЛІІ

ЛЁНДАН, 27. Уплыў „апалітычнага" саюзу гарнякоў, арганізаванага і кіруемага Спэнсарам у Нотынгэмскай акрузе, усё больш падае сярод гарнякоў. На нядаўніх выбарах наглядальнікаў вугальных капальняў у Уэльбэку, кандыдатура самога Спэнсэра была адкінута пераважаючаю большасьцю галасоў. Абраныя кандыдаты, прапанаваныя нотынгэмскай асацыяцыяй гарнякоў, атрымалі 500 і 300 галасоў, у той час, як Спэнсэр атрымаў толькі 4 галасы.

### БЛЁК ПРАЦОЎНЫХ У БАЎГАРЫІ

ВЕНА, 1. Як паведамляюць з Сафіі, цэнтральны камітэт баўгарскай рабочай партыі зьвярнуўся з лістом да праўленьня сялянскага саюзу, партыі дробных рамясьнікоў, саюзу рамясьніцкіх арганізацый, саюзу інвалідаў, удоў і сірот, арганізацыі македонскіх, фракійскіх, добруджанскіх эмігрантаў і бежанцаў заходніх акраін, у якім прапануе стварыць „блёк працоўных" для сумеснага выступленьня на будучых выбарах у сельскія саветы, што пачнуцца 19-га лютага 1928 году. Належыць адзначыць, што работа [illegible] у ўлучэнне сацыял-дэмакратычнай партыі ў лік арганізацый, да якіх яна зьвяртаецца з прапановаю ўтварыць выбарчы блёк.

## „У Румыніі панує турма, а правы народу затоптаны ў гразь"

### НА СХОДАХ БЭСАРАБЦАЎ

БЭРЛІН, 1. З нагоды 10 гадавіны захопу Бэсарабіі Румыніяй, учора ў Бэрліне адбыўся мітынг пратэсту, скліканы таварыствам бэсарабцаў, у жыцьцю у Нямеччыне, супольна з лігаю абароны правоў чалавека, МОПР'ам і Інтэрнацыяналам.

Ва ўхваленай рэзалюцыі прысутныя на мітынгу пратэстуюць супроць захопу Бэсарабіі і супроць пануючага ў краіне тэрару, патрабуюць наданьня жыхарству Бэсарабіі права на самавызначэньне, безадкладнага выдаленьня акупацыйнага румынскага войска і назначэньня сьледчае камісіі для выяўленьня эканамічных і культурных пасьледчаў акупацыі.

На мітынгу была абрана дэлегацыя, якой было даручана перадаць румынскаму пасольству ў Бэрліне ўхваленую на мітынгу рэзалюцыю. Апроч таго, была адпраўлена тэлеграма румынскаму ўраду з патрабаваньнем безадкладна вызваліць Барыса Стэфанава.

* * *

ВЕНА, 1. Па атрыманых тут дадатковых вестках, на сходзе нацыянальна-сялянскай партыі ў Ясах выступалі і бэсарабскія дэпутаты Халіпа (былы віцэ-прэзыдэнт „Сфатул Цэрыя") і Стэра. Халіпа заявіў, што румынскі ўрад парушыў абяцаньне, якое даў „Сфатул Цэрыя" (нацыянальны збор Бэсарабіі) у 1918 годзе, бо ў Бэсарабіі зараз паноўе рэжым лютага прыгнечаньня. Румынскі ўрад ашукаў жыхарства Бэсарабіі і адабраў грамадзянскія свабоды, здабытыя коштам вялізарных ахвяр расійскае рэвалюцыі ў барацьбе супроць царызму. Стэра заявіў, што „ў Румыніі ў бягучы час панує толькі турма, а правы народу затоптаны ў гразь".

## Франка-амэрыканскі арбітражны дагавор

ПАРЫЖ, 1. У дыпляматычных колах пацьвярджаюць, што ў бліжэйшым будучым мае адбыцца падпісаньне франка-амэрыканскага арбітражнага дагавору. У прадмове да гэтага дагавору абодвы бакі ўрачыста заявяць аб сваёй адмове ад вайны, як зброі нацыянальнай палітыкі. Арбітраж ня будзе распаўсюджвацца на пытаньні, прадугледжаныя дактрынай Монроэ (Амэрыка для амэрыканцаў), паколькі гутарка ідзе аб Злучаных Штатах, і на пытаньні, прадугледжаныя статутам Лігі Нацый, паколькі гутарка ідзе аб Францыі.

## Па Савецкім Саюзе

### Падрабязнасьці аб савецкіх фальшыўках

МАСКВА, 2. Нядаўна паведамлялася аб працэсе польскага шпіёна ў Нямеччыне Шрэка, на якім выявілася, што г. зв. „ліст Зіноўева"—справа рук Пацюркоўскага. Карэспандэнт „ТАСС" даведаўся ў Вярхоўным судзе СССР аб наступным: Пацюркоўскі—афіцэр польскага генштабу, працаваў у польскім пасольстве ў Бэрліне, дзе высьвятляў працу савецкага пасольства. Пазнаёміўшыся з Дружылоўскім (другі аўтар савецкіх фальшывак, суд над якім нядаўна адбыўся ў Парыжы), ён на фальшывых бланках савецкага гандлёвага прадстаўніцтва ў Бэрліне і НК Замежных Спраў вырабіў фальшыўкі аб „выбарах у Прафінтэрн" і аб асыгнаваньні грошай для рабочай партыі і прадаў гэтыя фальшыўкі газэце „Чынага Трыбун", якая іх агаласіла. Разам з Дружылоўскім Пацюркоўскі вырабіў яшчэ рад фальшывак, якія таксама прадаў чужаземным ўрадам.

### Трэці пленум УсеЦСПС

МАСКВА, 2. Прэзыдыум УсеЦСПС пастанавіў склікаць трэці пленум УсеЦСПС 27 лютага.

### ЮБІЛЕЙ М. ГОРКАГА

МАСКВА, 1. Адбылося пасяджаньне камітэту па арганізацыі юбілею М. Горкага. Сьвяткаваньне прызначана на 29 сакавіка 1928 году. У пачатку мая чакаецца прыезд Горкага у СССР. Старшынём камітэту абраны т. Бухарын.

* * *

Дзяржвыдавецтва пастанавіла выдаць поўны збор твораў Максіма Горкага ў ліку 100.000 экземпляраў.

### З ўсіх куткоў СССР

*Адкрыўся 8 усесаюзны зьезд гарбарнікаў. У якасьці „засьцей на зьезьдзе прысутнічаюць сакратар саюзу рукавічнікаў Францыі Лябуро і дэлегат саюзу рымароў Даніі—Тэнсон.*

*— На Ленінградзкай абуткавай фабрыцы „Пралетарская перамога" значна павялічана вытворчасьць абутку для вёскі. Выпуск ботаў даведзен да 250 пар у дзень, а бацінак—да 1.300 пар.*

*— Кампанія па барацьбе з самагонам шырока разгарнулася па ўсіх акругах Сібіры. Асноўная маса насельніцтва адносіцца да кампаніі вельмі спрыяльна.*

*— За апошнюю пяцідзёўку студзеня ў Тамбоўскай губэрні заготоўлена хлеба на 40 проц. больш, чым за папярэднюю і амаль у пяць раз больш чым за першую.*

*— На ўсёй Татарыі за 6 пяцідзёўку заготоўлена 9.634 тоны хлебапрадуктаў супроць 6.000 тон за пятую пяцідзёўку. Усяго заготоўлена на працягу студзеня 26.657 тон.*

*— Для лепшага абслугоўваньня публікі і зьнішчэньня чэрг, каапэрацыйныя органы пастанавілі адкрыць 6 з паловаю тысяч новых кіёскаў, маркоў і палаткаў.*

## НАЧНОЕ РАДЫЁ

### Францускія рэакцыянэры дамагаюцца разрыву з СССР

ПАРЫЖ, 1. На ўчарашнім пасяджэньні францускага сэнату, прысьвечаным пытаньням замежнай палітыкі, сэнатар Жапі сказаў вялікую прамову, у якой дамагаўся разрыву з СССР, заявіўшы, што існуючыя франка-савецкія адносіны прыкрываюць прапагандысцкую работу бальшавіцкіх агэнтаў, у прыватнасьці савецкага пасла, якога абслугоўвае 350 чалавек служачых і 22 тэлефонныя лініі.

### У Латвіі падрыхтоўваўся фашысцкі путч

РЫГА, 2. Нядаўна ў Рызе распаўсюдзіліся весткі аб тым, што начальнік штабу латвійскай арміі генэрал Калейс падаў у адстаўку, матывуючы свой уход узьнішшымі паміж ім і яго памоцнікам, палкоўнікам Гартманам, разгалосьсямі. Тады-ж камандуючы латвійскай арміяй Радзінш заявіў:

„Калейс пераўтаміўся і хварэе та рэагуе на арабностні". Цяпер «Сацыял-Дэмакрат» выступае з выкрыцьцямі наконт сапраўдных прычын, якія прымусілі Калейса падаць у адстаўку. Па словах газэт, некаторыя вайсковыя колы ў часе абгаварэньня ў латвійскім сойме савецка-латвійскага гандлёвага дагавору падрыхтоўвалі путч з мэтаю зьвяржэньня сацыял-дэмакратычнага габінэту і ўстанаўленьня фашысцкай дыктатуры. Падрыхтоўкаю путчу кіраваў аф'цэр іншы. Ен склікаў патаемныя сходы афіцэраў, на якіх заяўляў, што дзейнічае ад імя і па даручэньні камандуючага арміяй Радзінша. Выступленьне павінна было адбыцца ў момант ратыфікацыі савецка-латвійскага гандлёвага дагавору. Аднак, некаторыя ўдзельнікі сходаў афіцыяльна паведамілі аб падрыхтоўцы путчу камандуючага арміяй Радзінша Апошні распарадзіўся зьмясьціць іншэ ў вайсковы шпіталь для псыхічнай экспэртызы. У шпіталі іншэ быў прызнаны псыхічна нармальным і вызвалены. Радзінш пастараўся захаваць усю справу ў таямніцы. Аднак, у хуткім часе гата гісторыя стала відома Калейсу і ён патрабаваў неадкладнага арышту Іншэ.

Іншэ быў арыштаваны. З утварэньнем новага ўраду Радзінш і Гартман ізноў дабіваюцца вызваленьня Іншэ. У гэтай глебе ўзьнікі непаразуменьні паміж Калейсам і Гартманам, якія скончыліся заявай Калейса аб адстаўцы.

## Дэпутаты Грамады ў „польскім Сахаліне"

Ахопленыя страхам перад рэвалюцыйным выступленьнем шырокіх беларускіх народных мас для вызваленьня папулярнейшых беларускіх дэпутатаў, кіраўнікоў стотысячнай Грамады, служкі фашысцкага дыктатара парашылі выслаць гэтых дэпутатаў ў «аддаленыя месцы» Польшчы, далей ад беларускіх народных мас. Такое месца знайшлося: гэта адзіночная турма ў Вронках.

Вронкі сярод палітзьняволёных называюцца «польскім Сахалінам», або ўсепольскім карцэрам.

Вронкі—гэта маленькае мястэчка ў 50 вярстох на захад ад Познані. Не дарма польская буржуазія выбрала месцам заключэньня барацьбітоў за рабоча-сялянскую справу гэту, самую рэакцыйную, правінцыю Польшчы. Бо і ў турме прыходзіцца змагацца з рэвалюцыянэрамі, уціхамірваць «непарадкі» сярод палітзьняволеных і Вронкі зьяўляюцца больш бясьпечнымі і выгоднымі для такіх уціхамірваньняў, чым Варшава, або Вільня, дзе рабочыя маюць «кепскую» прывычку заступіцца за лепшых сваіх сыноў, якія пакутуюць за кратамі.

«Польскі Сахалін»—гэта старая нямецкая цэнтральная катаржная турма. У гэтай турме у часе імпэрыялістычнае вайны сядзела Роза Люксэмбург. Турма гэта складаецца выключна з адзіночак. Іх кала 1.000. Некалькі сот гэтых камор—каморы-труны (аўтар гэтых радкоў сядзеў у такой «труперні» 5 месяцаў) у паўтара аршыны шырыні і 2 з пал.—3 аршыны даўжыні. Каморы наогул вельмі вільготныя (увесну і ўвосень на калідорах стаіць вада) і зімою вельмі слаба апальваюцца. У самыя моцныя маразы каморы апальваюцца ўсяго некалькі гадзін і то так слаба, што толькі трубы ледзь цеплыя. У такіх каморах трымаюць нават хворых сухотамі. Усё гэта, аднак, нішто ў параўнаньні з адміністрацыйным рэжымам.

Надворна—адносіны адміністрацыі ня грубыя, яны разьлічаны з нямецкай акуратнасьцю, каб фізычна і маральна ўплываць на палітзьняволеных. Зьняволеныя так ізаляваны, што, седзячы на адным і тым-жа калідоры, яны ніколі ня бачаць адзін другога. Прагульваюцца маленькімі групкамі, або адзінкамі. Калі вядуць арыштаванага, калідоры аслабяноюцца ад другіх, якія выпадкова знаходзяцца на іх, або прымушаюць стаць тварам да сьцяны.

Усе зьняволеныя, апрача тых, якія знаходзяцца пад сьледзтвам (а апошніх усяго 8-10 проц.), апранутыя ў арыштанскае адзеньне. Яшчэ нядаўна прымушалі палітзьняволеных астрыгаць галовы, вусы і бараду; перад сном выносіць вопратку з каморы. Зімою даюць сьвятло толькі да вячэры, г. зн. да 5 з пал. гадз., а за свой кошт—яшчэ на дзьве гадзіны. Лісты можна адсылаць толькі ў два тыдні раз, разьмерам ня больш аднаго паштовага аркушу. Тое самае з атрыманьнем—наведамляюць, што прышлі такія і такія лісты, а вы даюць іх па адным праз 2 тыдні. За самы малы «злачын»—карцэр.

Многія таварышы ня вытрымліваюць такога рэжыму, вар'яцеюць, канчаюць жыцьцё самагубствам. Так, павесіўся 12-га лютага 1926 г. адзін з умоўных [illegible] дзінскага пралетарыяту т. Калужа, жадаючы, такім чынам, зьвярнуць увагу «цывілізаванага сьвету» на ўмовы ў Вронках. Галадоўкі ў гэтай турме ліквідуюцца адміністрацыйным парадкам. Такім-жа чынам была ліквідавана 9-дзённая галадоўка ў сакавіку 1927 г.

Вось у якой турме польскі фашысцкі ўрад, былога сацыялістага Пілсудзкага мучыць прадстаўнікоў працоўных Заходн. Беларусі ў польскі парлямант.

Умовы, у якіх жывуць усе палітзьняволеныя, зьяўляюцца «прывілеяванымі» ў параўнаньні з рэжымам, у якім знаходзяцца Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі і іншыя. Для іх створан асобны рэжым. Яны так ізаляваны, што мы, старажылы Вронак, толькі 2 месяцы пасьля іх прыбыцьця ў Вронкі, даведаліся, дзе яны знаходзяцца і ў якіх умовах. Паверх, на якім размясьцілі дэпутатаў, быў звольнен нават ад крымінальных злачынстваў. Адзін ад аднаго дэпутаты аддзелены рядам пустых камер, куды яны не магілі абмяняцца словамі шляхам перастукваньня. На спацыр хадзілі адзінкамі і толькі з канца лета—па двое. З тай прычыны,

**Вясковы актыў, будзь арганізатарам працы па рэалізацыі пазыкі ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі!**

# ЖЫЦЬЦЁ ПАРТЫІ

## Больш увагі калектывізацыі сельскай гаспадаркі

Дырэктывы 15 партзьезду аб калектывізацыі, абагульненьні сельскае гаспадаркі знайшлі глыбокі водгук на вёсцы. Вёска вельмі жвава і досыць часта асабіста гэтыя дырэктывы тлумачыць. Вельмі часта ўся бяда заключаецца ў тым, што вёска ня ведае, як да гэтых дырэктыў практычна падыйсьці. Нашы партячэйкі і камсамольскія ячэйкі часамі таксама ня ведаюць, што ім рабіць. Адсюль ёсьць выжыдкі, калі шуканьне новых форм развіцьця гаспадаркі з боку сялянства праходзіць вобмацкам, упоцемках праз галаву парт. і ЛКСМ ячэек і без дастатковай дапамогі з боку савецкіх і кааперацыйных установаў. Такія зьявішчы мелі месца ў дзьвюх вёсках Аршанскага раёну.

Гэтымі днямі ў в. Бортнікава, Аршанскага р-ну, адбыўся сход сялян на пытаньні аб пераходзе гэтай вёскі на статут камуны. У той жа дзень 9 гаспадарак недалёка лежачай вёскі Кашына прынялі статут камуны. Калі ім прадаўнікі Райзо прапанавалі на выбар статут камуны і статут арцелі, то яны аднагалосна спыніліся на статуце камуны, заявіўшы, —калі ламаць старыя формы гаспадаркі, то ламаць адразу і грунтоўна.

Арганізатарамі і кіраўнікамі працы на калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў гэтых вёсках зьяўляюцца беспартыйныя сяляне-актывісты. Трэба ад пачаткі, што партыйная і ЛКСМ ячэйкі нават ня пры помачі сваіх представнікоў на першы арганізацыйны сход камуны, як гледзячы на тое, што першая паход ідзе на адлегласьці ўсяго 6 вёрст, а другая—1½ вярсты.

З размоў з сялянамі гэтых дзьвюх вёсак стала ясным, што да думкі аб арганізацыі камуны яны прыйшлі самі на глебе цяжкога матар'яльнага становішча і ўпэўненасьці ў тым, што індывідуальная сялянская гаспадарка ня можа разьвязаць іх балючых пытаньняў аб недахопе зямлі, лугу, прадуктаў харчаваньня і г. д.

Абстановка, у якой гэтым упартым і настойлівым перадавікам-сялянам прышлося весьці працу па падрыхтоўцы пераводу гаспадаркі на калектыўныя рэйкі, увесь час была неспрыяючай. Яны ня толькі сустракалі насьмешкі і зьдзекі, што ая іх фантастычнай выдумкі нічога ня выйдзе, але ім прышлося і зараз прыходзіцца весьці працу ў варожым абкружэньні. Супроць іх скарыстоўваецца ўсё, пачынаючы з асабістай дыскрэдытацыі і канчаючы нацкоўваньнем часткі беднаты.

Бедноту стараліся застрашыць, што адсутнасьць у яе сродкаў пакіне яе за бартом камуны і арганізаваная камуна захопіць лепшыя вучасткі ральні, а бедната будзе выслана на балоты. Член сельсавету ў в. Бортнікава, які не спачувае справе арганізацыі камуны, пушчае чуткі, што арганізацыя камуны—гэта серапяцкая выдумка, накіраваная супроць інтарэсаў беднаты. У в. Кашына заможныя элементы скарысталі настроі беднаты для стварэньня хутарскіх настрояў.

Трэба адзначыць, што на вёсцы аб камуне гуляюць самыя недарэчныя ўяўленьні. Кулацкія элементы распускаюць правакацыйныя чуткі, што камуна—гэта новая форма прыгону. «Я сам пайшоў бы ў камуну,—кажа бедняк,—але баюся нашкодзіць сваім дзецям». Нават самыя арганізатары на ломку старых форм ішлі больш інтуіцыйна, чымся сьвядома. З статутам камуны непартыйныя камунары в. Кашына ўпершыню пазнаёміліся на першым арганізацыйным сходзе пры афармленьні камуны. Яны перадавалі, што ўсе спробы іх да гэтага сходу атрымаць статут ў акрэа і сельсаюзе і пазнаёміцца з палажэньнямі аб камуне не ўдаваліся.

Нашы газэты многа пішуць аб неабходнасьці калектывізацыі сельскае гаспадаркі і зусім мала пішуць аб тым, як будаваць гэту гаспадарку. Між тым асобныя партыйцы і ЛКСМ не ўяўляюць сабе добра разьніцы паміж калектывам і камунай. Мала зусім на старонках газэт высьвятляецца праца і жыцьцё існуючых арцеляй, калектываў, камун. Добра было-б, каб газэты на сваіх старонках друкавалі-б прыкладныя статуты камун, арцеляй, калектываў таму, што на іх на вёсцы вялікі попыт, а ў акруговых цэнтрах іх маецца ў абмежаванай колькасьці.

Б. Стасэвіч.

## Нарады склікаць ня менш трох разоў у год

Па пытаньні аб скліканьні вытворчых нарад партыйцаў і камсамольцаў — сельскіх гаспадароў тав. Хацімскі вельмі своячасова і правідлова высунуў пытаньне.

У нашым Высачанскім раёне, Віцебскай акругі, мы падобную нараду правялі ў красавіку месяцы 1927 году, дзе быў даклад агранома, а таксама стаяў даклад РК КП(б)Б аб выніках агляду гаспадарак партыйцаў раёну. Сярэчкі, якія шырока разгарнуліся, накіраваліся да аднаго асноўнага пытаньня — як камуністаму палепшыць сваю гаспадарку. Гаварылі аб труд насьцях (шмат партыйных «нагрузак», адсутнасьць сродкаў і г. д.)

Вынікі гэтае нарады натыкаюцца на наступную думку: трэба гэткія нарады праводзіць рэгулярна, ня менш трох раз у год—прыблізна так. зімою перад пачаткам вясеньняй сельска-гаспадарчай кампаніі, увосень—вынікі вясеньніх і летніх сельска-гаспадарчых работ і задачы на зімовы пэрыяд, зімою перад раённым зьездам саветаў для абгаварэньня вынікаў працы райвыканкому ў галіне сельскай гаспадаркі. Сачыць за правядзеньнем усіх пастаноў нарад у жыцьцё; мацной уцягваць у гэткія нарады камсамольцаў-гаспадароў, нарады рабіць пакуль што пры райкомах для лепшага іх абслугоўваньня культсіламі; надавать нарадам канкрэтны характар, больш практыкі, менш агульных пытаньняў.

Па пытаньні аб кіраўніцтве ячэйкай гаспадарчым і культурным жыцьцём вёскі трэба сказаць, што мы павінны падумаць аб разгрузцы ячэйкі. Ячэйка ў нас перагружана рознымі кампаніямі, абежнікамі, пісанінай і г. д. Гэта не па віне РК. Увесь гэты матар'ял, які мы атрымліваем ад акружкому, мы толькі ў незначнай меры пасылаем у ячэйкі, а калі пабачыш, дык і то многа. Асабліва шмат запросаў па пытаньнях кампаній і г. д.

Падругое, трэба узмацніць узрост сельскіх ячэек, а то яны пры сваёй малой колькасьці ня маюць магчымасьці добра кіраваць працай у вёсцы, і патрэцце, гэта неабходнасьць даваць ячэйкам канкрэтныя дырэктывы па пытаньнях сельскай гаспадаркі.

А. Эльман.

# РЭАЛІЗАЦЫЯ ПАЗЫКІ У БССР

## Словам і справай

### Да ўсіх членаў саюзу с.-г. рабочых

**Ліст цэнтральнага праўленьня саюзу**

Дарагія т. т. батракі і батрачкі, пастухі, рабочыя саўгасаў, лясьнікі, лесарубы, плытагоны, рабочыя тарфяных і мэліярацыйных распрацовак, рабочыя дробных прадпрыемстваў на вёсцы і ў мястэчках, аграномы, каморнікі, лесаводы, мэліяратары, служачыя зямельных устаноў, студэнты с.-г. акадэміі і с.-г. тэхнікумаў, рабфакаўцы, курсанты цэнтральных батрацкіх курсаў і прафактыў саюзу!

Рабочая кляса СССР пад кіраўніцтвам партыі вядзе ўпартую работу па будаўніцтве сацыялістычнае гаспадаркі. Галоўная, першачарговай важнасьці, задача, якую повінен выканаць пралетарыят і працоўнае сялянства—гэта індустрыялізацыя нашу краіну.

Гэта грандыёзная задача можа быць выканана пры ўмове, калі сельская гаспадарка будзе праз калектывізацыю ўзьнята на вышэйшы культурны ўзровень, калі пад сельскую гаспадарку будзе падведзена тэхнічная база.

Правядзеньне мерапрыемстваў індустрыялізацыі і разьвіцьця сельскае гаспадаркі патрабуе вялікіх сродкаў, спадзяваецца на дапамогу капіталістых ня прыходзіцца.

У сувязі з гэтым перад нашым саюзам стаіць важная задача словам і справаю дапамагчы савецкай уладзе рэалізаваць пазыку «ўзмацненьня сельскай гаспадаркі».

Правядзеньне работы па рэалізацыі пазыкі зьявіцца самаправеркай для нашага саюзу, які зьяўляецца правадніком пралетарскага ўплыву на працоўнае сялянства.

У першую чаргу ўсе члены саюзу, і асабліва прафактыў, павінны добра азнаёміцца з умовамі пазыкі і парадкам падпіскі. Трэба праводзіць групавыя і індывідуальныя гутаркі з сялянамі аб умовах падпіскі і яе значэньні.

Кожны член саюзу павінен паставіць перад сабою задачу—завербаваць у падпісчыкі сваіх суседзяў-сялян і самому быць прыкладам у гэтай справе.

Старшыня Цэн саюзу с.-г. і лясных рабочых ВАЙТЭНКАЎ.

## ПАДСТАЎ НА ЦЭЛЫ ТЫДЗЕНЬ

**Магілеў.** (Уласны кар.). Амаль што поруч знаходзяцца Лупалаўскі і Магілеўскі райвыканкомы—ня больш 3-х вёрст. А ў адносінах падрыхтоўкі да распаўсюджаньня сялянскай пазыкі другі адстаў ад першага на цэлы тыдзень.

На Лупалаве адбылася яшчэ 25-га студзеня нарада кантрагентаў райвыканкому, сельсаветаў і кааперативаў, яны праінструктаваны, атрымалі літаратуру і аблігацыі, ужо на ўсіх сельсаветах наладжаны продаж аблігацый.

А Магілеўскі райвыканком аблігацыі трымае пры сабе. Па раёне яшчэ не прадана ніводнай аблігацыі. Нарада ў райвыканкоме адбылася толькі 31-га студзеня.

К. Лапцяў.

## 11.462 руб. у Бабруйшчыне

**БАБРУЙСК.** (Па телеф. ад ул. кар.). Даныя аб ходзе рэалізацыі пазыкі за апошнюю пяціднёўку студзеня паказваюць, што распаўсюджваньне пазыкі па Бабруйшчыне ідзе здавальняюча.

У працягу азначаных 5-ці дзён рэалізавана пазыкі: па Асіпавіцкім раёне—на 1.520 р., па Глускім на 1.997 р., па Жлобінскім—на 1.105 р., па Бабруйскім—на 2.368 р., па Слуцкім на 1.147 р., па Парыцкім—на 1.100 р.

Па ўсёй акрузе на 31-га студзеня рэалізавана пазыкі на 11.462 р.

## На 360 руб.

**КОПЫСЬ** (Аршаншчына). Па Копыскім раёне сетка кантр-агентаў па рэалізацыі пазыкі складаецца з 50 чалавек. Па 30-га студзеня рэалізавалі пазыкі на 360 руб.

## Прайшлі толькі 2 дні, а вынікі вялікія.

**СЛУЦАК.** (Уласны кар.) Нядаўна адбыўся зьезд упаўнаважаных слуцкага крэдытнага таварыства ў ліку 136 чалавек. Зьезд пастанавіў: усім упаўнаважаным таварыства стаць кантрагентамі для распаўсюджаньня пазыкі.

Зараз-жа па прыняцьці гэтай пастановы 80 упаўнаважаных узялі аблігацыі на 3.500 руб для распаўсюджаньня сярод сялянства.

Ужо ёсьць рэальныя вынікі гэтае працы: упаўнаважаныя за два дні рэалізавалі аблігацый на суму 795 р. Грошы поўнасьцю зданы ў касу.

Як.

## Ні адзін не застаўся з боку

Добра прайшла падпіска на пазыку сярод рабочых савецкіх гаспадарак «Блонь» і «Молат» Юравіцкага раёну. Ніводзін член саюзу не застаўся без аблігацыі.

Па савецкай гаспадарцы «Молат» падпісаліся рабочыя, пастухі, канюхі і нават дайлішчыкі, кожны з іх атрымлівае невялікую пэнсію. Падпіска дала 225 руб. Такая-ж падпіска праведзена рабочымі гаспадаркі «Блонь»

В.

## У нас сьпяць

**СУРАЖ** (Віцебшчына). Наш раён цягнецца ў хвасьце: мала літаратуры і плякатаў, няма належнай папулярызацыі пазыкі. У вёсках сяляне нічога ня ведаюць пра пазыку. Трэба прымусіць раённыя арганізацыі разварушыцца—інакш раён прасьпіць усю кампанію.

## Што дала Менская акруга

Паводле вестак Акрфа, на сёньнешні дзень рэалізавана сялянскае пазыкі: у Самахвалавічах—на 1.200 руб., у Плешчаніцах—на 1.367 р. 50 к., у Смалявічах—3.000 руб., у Чэрвені 108 р., Капылі—180 р., па г. Менску, канторацю ўсекабанку рэалізавана 155 р., галоўнай касай ашчадняасьці—497 р. 50 к., сельска-самагужным саюзам—450 руб. і Акрфа—410 руб. Усяго пакуль што рэалізавана аблігацый пазыкі на 7.368 руб.

## Магілеўшчына дала 3.500 р.

**МАГІЛЕЎ.** (Уласны кар.) Пакуль што ёсьць весткі аб тым, што у Карэе рэалізавана пазыкі на 500 руб., у іншых мястэчках на 3.000 руб.

Прызначаная на акругу сума ў 523.000 руб. разьмеркавана па раёнах у адпаведнасьці з лікам двароў і моцнасьцю раёнаў.

Ад імя старшыні Акрвыканкому разасланы таварыскія лісты членам і кандыдатам выканкомаў аб садзейнічаньні ў рэалізацыі пазыкі. Таксама разасланы лісты раённым і сельскім камітэтам узаемадапамогі: кожны камітэт павінен набыць аблігацый на 20 руб. і распаўсюдзіць аблігацый на 500 р.

К. Л.

# ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

## Сельскія камуны на Бабруйшчыне

Перавыбары калгасаў на Бабруйшчыне праходзілі вялікай актыўнасьцю. Пайшчыкі ўдзельнічалі ў перавыбарных сходах у складзе 96 проц. Асаблівая зацікаўленасьць праяўлялася пры вырашэньні пытаньняў унутранога распарадку (разьмеркаваньне прыбыткаў, арганізацыя непадзельных капіталаў і г. д.).

Пры абмеркаваньні гэтых пытаньняў выявілася ўзрослая сьвядомасьць у адносінах калгаснага будаўніцтва. Калі ў мінулыя гады такія прынцыповыя пытаньні калгаснага будаўніцтва, як аграмаджаньне сродкаў вытворчасьці, стварэньне непадзельных капіталаў і інш., на гадавых сходах не атрымлівалі вырашэньня ці праводзіліся вельмі туга—у гэтым годзе яны ў сваёй большасьці вырашаліся пры актыўным удзеле саміх калектывістых.

Вялікую актыўнасьць, у параўнаньні з мінулым годам, выявілі жанчыны, якія ўдзельнічалі ў сходах у складзе 100 проц., высоўвалі пытаньні аб стварэньні ясьляў (арцелі «Надзея», «Вольная Праца» і інш.), высоўвалі пытаньне аб неабходнасьці канчатковага аграмаджаньня дробнае жывёлагадоўлі (сьвіней, авечак і інш.), праца па дагляду за якімі цалкам ускладаецца на плечы жанчын (арцелі «Воля», «Грабавікі», «Расьсьвет»).

Жанчыны з жалем адзначалі сваю адсталасьць і больш слабое разьвіцьцё параўнальна мужчынамі і з абразай паказвалі на тое, што культурныя працаўнікі раёну, у прыватнасьці жанарганізатары, не праводзяць ніякай працы сярод жанчын-калектывістак.

З асаблівай увагай калектывістыя падыходзілі да выбараў кіраўніча - кантрольных органаў. Тыя працаўнікі, якія праявілі сябе на працы ў якасьці кіраўнікоў у мінулым, зноў абіраліся.

Ш—віч.

## Мэліярацыя Чапялінскіх балот

**ГОРКІ.** (Уласны кар.). На Чапялінскіх балотах, Горацкага раёну, пры дапамозе Сельска-Гаспадарчай Акадэміі сяляне прарабілі вялізарную працу па мэліярацыі. Ужо асушана 400 дзесяцін балота. Зараз праектуецца на балоце пабудаваць электрастанцыю.

## 60.000 руб. за тры месяцы

**ВОРША.** (Уласны кар.). Па спажывецкіх таварыствах „Дняпрасаюз" за першыя кастрычнік—сьнежань лік пайшчыкаў павялічыўся на 11.000 чал., а паявы капіталы—на 60.000 руб. За студзень м-ц ад 37 проц. усіх спажывецкіх таварыстваў паступіла паявых узносаў на 16.768 руб. Першым па зборы паёў ідзе Асінаўскае і Лядзянскае спажывецкія таварыствы.

## Вял[і]к пажар у Самахвалавічах

### Згарэў будынак райвыканкому

**У ноч на 2 лютага згарэў будынак Самахвалавіцкага райвыканкому. У агні загінулі ўсе справы райвыканкому. На месца пажару выехалі акруговы пракурор і прадстаўнік Менакрвыканкому для высьвятленьня прычын пажару.**

## Суровыя меры супроць самагоншчыкаў

### (Ад нашага магілеўскага карэспандэнта)

Колькасьць узбуджаных па акрузе самагоначных спраў складаецца такім чынам: у другім квартале—690, у трэцім—372 і ў чацьвертым—550 спраў.

Такім чынам, відавочнае зьніжэньне ў трэцім квартале і павышэньне ў чацьвертым.

Адначасова прымячаецца ўдасканаленьне мер барацьбы з самагонам: міліцыя больш б'е па самагоначных «цэнтрах», лік адабраных самагоначных апаратаў, зьнішчанай самагонкі і бражы ўсё павялічваецца. Для барацьбы з самагонам ужываюцца міліцыянэры коннага рэзэрву; так, адзін атрад іх у Магілеўскім раёне за 4 дні склаў 116 пратаколаў.

Прэзыдыум акрвыканкому, зазначыўшы некаторае павялічэньне самагонакурэньня (найбольш адзначаецца ў гэтай справе кулацкі элемэнт) і паслабленьне мер барацьбы, ухваліў сурова ажыцьцявіць усе пастановы аб мерах барацьбы з самагонакурэньнем і збытам самагону.

На вінаватых прапанавана райвыканкомам і гарсавету адміністрацыйныя спагнаньні пакладваць у працягу трох дзён, каб па чацьверты дзень ужо спаганяць накладзеныя штрафы. Усе неразгледжаныя справы разглядзець у два дні.

Калі справа павінна быць перададзена ў суд, рабіць гэта без затрымкі. Суд павінен разглядаць такія справы без чаргі.

К. Л.

— Бабруйскай акруговай міліцыяй за адзін дзень разгледжана 7 спраў па самагонакурэньні. Наложана штрафу на 425 руб. і па адной справе дана 2 месяцы прымусовых работ. (Уласны кар.).

## Прысьпешацца лесаўпарадкаваньне па вадазборы Дняпра

**МАГІЛЕЎ.** (Уласны кар.). Па Магілеўскай акрузе лесаўпарадкаваньне пачата ў 1925 годзе. Да гэтага часу ўпарадкавана 82.400 гектараў—25 процантаў лясной плошчы.

Калі-б працягваць лесаўпарадкаваньне такім-жа тэмпам, як дагэтуль, дык на скончэньне яго патрэбна-б было яшчэ 7 год.

Але кіраўніцтва лясоў, улічваючы эканамічную важнасьць вадазбораў ракі Дняпро, парашыла скончыць лесаўпарадкаваньне ў працягу 2 год.

Адпаведна павялічваецца штат працаўнікоў на лесаўпарадкаваньні. Сёлета ў межах Магілеўскае акругі будзе працаваць замест 2-ці—50 чалавек. На гэту працу адпушчана 100 тысяч рублёў.

# Цэнтральная задача культработы кампаніі

Задачы шырокай культурна-асьветнай работы ў кампаніі пастаўлены партыяй у поўным абхвате. Работа ўключае ў сябе як разгортваньне масавай кампаніі агітацыі і прапаганды, так і арганізаваную падрыхтоўку і перападрыхтоўку кааперацыйных працаўнікоў на ўсіх сыстэмах кааперацыі (сетка курткоў і курсаў, планы навучаньня, праграмы, пытаньні камплектаваньня, фінансаваньня і іншае). Для сталага кіраўніцтва гэтай работай, пры цэнтральным кааперацыйным савеце Беларусі створана пастаянная культурна-асьветная камісія з представіцеляў усіх кааперсыстэм, Наркамасьветы.

У вынест масавае кааперацыйнае агітацыі і прапаганды павінна ўваходзіць спалучэньне шырокіх рабоча-сялянскіх мас з роляю і задачамі пашырэньня яго ў плянавым парадку в усёй народнай гаспадарцы краіны, прамысловай кааперацыі патрэбны кадры кваліфікаваных рабочай сілы. Гэтыя кадры ён праходзіцца ствараць пазова з адгадам, ненакучаных, а часамі і нязьмешаных пластоў насельніцтва. Гэта выклікае неабходнасьць асабліва наружана праводзіць культурную работу ў гэтай частцы кааперацыйнае сыстэмы.

Цэнтральным момантам культурна-асьветнае работы трэба ўсё-ж лічыць вытворчую агітацыю і прапаганду.

Гэта агульная ўстаноўка культурна-асьветнае работы прамысловае кааперацыі і замацавана апошнім дэкрэтам СНК ад 5 мая 1927 г. і выяўляецца абавязкова у адносінах да ўсіх зьвяшчаных кааперацыйнае сыстэмы: сэка, арцеляў і таварыстваў.

У адпаведнасьці з гэтым неабходна ўжыць усе меры да зібесьпячэньня кіраўніцтва па лініі арганізацыйнага афармленьня культурна-асьветнае работы ў саматужна - прамысловых саюзах.

Сур'ёзнае значэньне таксама набывае цэнтар, у нашых умовах, культработа ў кватэрнай кааперацыі. Тут элементы культасьветнае работы непасрэдна ўвязваюцца з арганізацыяй культурна-бытавых умоў кааперавання масы, а таксама найбольшым абхватам жанчын—хатніх гаспадынь. Палажваючы эдпаведную работу, удаецца шырока і поўна ўцягнуць адсталую жанчыну ў нашае будаўніцтва, у практычную кіруючую і кантралюючую работу кааперацыі.

Партыя вызначыла тое важнае месца, якое павінна займаць кааперацыя ў нашай народнай гаспадарцы, у нашым сацыялістычным будаўніцтве. Нам трэба заўсёды памятаць наказы Ільліча аб «разве цывілізаваных кааператараў», аб неабходнасьці правядзеньня культурнае рэвалюцыі.

А мы часта наглядаем выпадкі, калі кіраўнікі кааперацыйных арганізацый нічога ня робяць у галіне культурна-асьветнае работы. Літаратуру, якая часта ім пасылаецца, яны зварачаюць назад „нам, моў, няма часу гэтым займацца" а ў справаздачы аб дзейнасьці і становішчы раёну пытаньне аб культурна-асьветнай працы ўключыць лічаць за лішняе. Падобным зьявам трэба пакласьці канец. Гэта гаворыць аб тым, што культурна-асьветная работа ў кааперацыі зьяўляецца крайняй неабходнасьцю; дырэктывы партыі ў галіне культурна асьветнае работы ў кааперацыі павінны быць абавязкова выкананы.

А. Фікс.

# 1920 ГОД

БАЗЫЛЬ СТАШЭЎСКІ

## Успаміны аб партызанскім руху на Беларусі

Кулацкая частка вёскі нездаволена была бальшавіцкай «продразвёрсткой», уздымам беднаты ў 1919 годзе. Вось чаму, калі зьявіўся ў вёску Сьвінку, Капыльскага раёну, атрад легіянэраў Пілсудзкага, дык кулацкая тройка вынесла стол з хлебам, сольцю.

Мне не давялося бачыць гэтае «ўрачыстасьці», я быў на полі, як і наогул большая частка мужчын.

Пад вечар у канцы вёскі амаль усе сабраліся і абгаворвалі міжнароднае палажэньне. Тут-жа сталі два гэрої спатканьня «высокіх гасьцей».

— А што-ж яны ўсё-такі казалі вам, давалі запытаньні адны.

— Можа пра зямлю, што-небудзь?

з усьмешкай пыталіся другія.

— Вось прагонім бальшавікоў і ўсё будзе добра. Вось што казалі «высокія госьці». Вядома далікатна разьвіталіся і паехалі далей—адказаў «гэрой».

— О, паны заўсёды далікатныя. З лёгенькаю ўсьмешкаю дадаў адзін.

— Але часам чалавеку дух вымае гэтае далікацтва, неяк гучна бухнуў другі.

— Нічога ня вымае, усё будзе добра, спакойна, ня так, як з гэтымі абадранцамі бальшавікамі—адказаў «гэрой».

— Ну, дай-жа божа... будзем бачыць... ня было добрага, ня будзе... пекла будзе... зямлі ня будзе... трэсца будзе...

—А хто гэта можа знаць, што будзе...

Вось зьмест гутарак гэтага падвячорку.

Прайшло некалькі дзён, становішча прасьвятлялася. У ваколічныя маёнткі вярнуліся паны, эканомы. Склікалі вёску, прымушалі вярнуць маемасьць, хто захапіў. Так было ў маёнтках: Над Нёман, Аталаве і іншых. З мястэчка Пясочна, вёсак Касьцяшоў, Яршоў, некалькі чалавек пачалі ў Баравікую турму (пасьля выпусьцілі). Мая вёска Сьвінка больш-менш спакойна адчувала сябе, бо блізка маёнтку ня было, дзе-б сяляне маглі зачапіцца і, такім чынам, здавалася, што ўсё абыдзецца бяз пратэнзій.

Праз некаторы час атрымоўваю запіску ад лясного стоража з фальварку графіні Красінскай—Мар'янава.

Справа ў тым, што перад прыходам белапалякаў пад маім кіраўніцтвам наладжан быў у гумне гэтага фальварку спэктакль і для пабудовы сцэны былі скарыстаны засекі з сьвірну.

У запісцы прапанавалася прыезьдці ўсё ў парадак, бо інакш справа пойдзе вышэй. Добрыя людзі памаглі мне і справа вышэй не пайшла.

Неяк наўзабаве ідзу я па вуліцы вёскі, наганяюць мяне два легіянэры і прапануюць ісьці ў хату. Зайшлі. Тут яны абвясьцілі мяне арыштаваным і пачалі рабіць вобыск. Знайшлі маё студэнцкае пасьведчаньне (Менск, падаг. інст.) і пячатку культ-асьветнага гуртка. Адзін з іх назваў сябе студэнтам Львоўскага І-ту і зазначыў, што культурна-асьветныя гурткі ў большасьці зьяўляюцца рэвалюцыйнымі арганізацыямі.

У хату ўвайшоў мой малодшы брат. Арыштавалі і яго. Не знайшоўшы нічога бальшавіцкага, легіянэры паехалі, але пры адъезьдзе зазначылі, што вобыск яны павінны былі зрабіць, паколькі нас рэкамэндавалі, як бальшавікоў гэтае вёскі.

Гэтым часам да вёскі даходзілі чуткі аб панскім «далікацтве» пад выгляд: «двазесьце пеньць».

Вобыскі, якія адбываліся па іншых вёсках з мэтаю вышуку зброі, ня мінулі і мае вёскі.

1 кастрычніка ад Магільнянскага пастарунку зьявіліся два жандары, выклікалі па імені і прозьвішчы 3-х хлапцоў і прымусілі лезьці на старую ліпу, дзе было вялізнае буслава гняздо.

Там былі схаваны стрэльбы, і як мы пасьля здагадваліся, дазналіся яны аб гэтым ад старасты нашае вёскі. Забралі стрэльбы, арыштавалі гэтых 3-х хлапцоў (павялі ў м. Магільна).

1 кастрычніка заўсёды ў м. Пясочна бывае фэст.

Этап спыніўся тут, каля варот цьвінтару. Старшы жандар пайшоў да былога ўрадніка Зарамбоўскага, а другі застаўся з арыштаванымі. Дазнаўшыся аб гэтым здарэньні, я прапанаваў сыну Зарамбоўскага настаўніку запрасіць мяне на абед да сябе, каб там, можа за чаркаю, вываліць хлапцоў.

Праз некаторы час я сьмела адчыніў дзьверы і мяне пазнаёмілі са «старшым».

Сям'я Зарамбоўскіх спаткала мяне далікатна і гэта мабыць выклікала далікацтва да мяне з боку «старшога». Яго ўгаварылі. Праз некалькі хвілін хлопцы сталі перад імі і слухалі яго грозную прамову: «Сёньня з прычыны набажэнства, фэсту, адпускаю, а крыеду праз тыдзень». Хлопцы падрыхтаваліся да спатканьня «гасьцей». Зьявіліся. Гарнец гарэлкі сталі перад імі. Дасталі скрыпачку і праз некалькі мінут наш музыка пачаў іграць. Жандар стараннa выводзіў бальшавіцкі марш (інтэрнацыянал).

На гэты час абышлося добра.

Аж зьяўляюцца адказ некаторы час новыя «госьці». Пейкія два легіянэры, якія легіянэры, жывуць у вёсцы некалькі дзён. Ходзяць чуткі, што гэта тайная паліцыя.

Аднаго разу выклікаюць яны 2-х хлапцоў-падросткаў, распытваючы аб бальшавікох, зладзеях, б'юць іх шампаламі.

Гэтае зьявішча зрабіла цяжкое ўражаньне ў вёсцы, асабліва на моладзь.

Была вечарынка, прышлі і легіянэрчыкі. Мы парашылі даць ім гарэлкі, але запытаць, за што яны білі хлапцоў.

Кончылася вечарынка, засталося 10 хлапцоў і 2 легіянэры. Некаторыя хлапцы трымалі сябе паваяцку, прыходзілася стрымліваць іх. Легіянэрчыкі адчувалі сябе дрэнна. Напалоханыя іх выгляды выклікалі асаблівую сьмеласьць у хлапцоў і яны гатовы былі разарваць «гасьцей» у шматкі.

— Пажар. Крыкнуў адзін, убягаючы ў хату

Усе выскачылі на вуліцу. Гарэла гумно майго брата (у якога я жыў). Была гадзіна ночы. Хто падпаліў, не вядома. Праз дзень-два легіянэры выехалі.

— Што гэта будзе, што будзе? Ці доўга так будзе? Вось запытаньні, якія прыходзілася чуць часьцей і часьцей.

У маёй вёсцы, амаль з першых дзён [illegible] ся група адважных хлапцоў. Была і зброя. Была ўзброеная група і ў м. Пясочна.

Сувязь была наладжана з двума пунктамі: Слуцкам і Менскам.

У нейкі сьвяточны дзень, ці нядзелю праз Сьвінку праскочыў аўтамабіль з польскімі афіцэрамі. Напрамак яго быў на маёнтак Іодкі, Налнёмая праз Пясочна і далей на Магільнае. Гэта было пад вечар. А ў гэты вечар пазначана было спатканьне каля рэчкі Лоша ўзброеных груп Песачанскіх і Сьвінскаўскай.

Пясачанская група сядзела ў гумне і вось, калі аўтамабіль паехаў у м. Пясочна, яны з гумна далі залп па ім. Аўтамабіль вярнуўся у Сьвінку, да гэтага часу абозы раськінуліся па ўсім выгане, потым падъехала артылерыя. Уся вёска была акружана ў працягу ўсяе ночы. Яшчэ з вечара было вядома, што ў Пясочна накіроўваецца эскадрон коньніцы, каб абкружыць і спаліць яго. Прабраўшаца ў Пясочна ня было ніякай магчымасьці. Ранідою, чуць золак, мне ўдалося з некалькімі хлапцамі, адкрыўшы у абозе некалькі скрынак з патронамі і стрэльбамі (калі «гэрої» ламалі куфры, пілі «млека»), перабегчы на Магільна і потым у лясок.

Рушыліся з выгану ўсе фурманкі, праехала коньніца. Загарэліся новыя масты праз р. Лошу. Ніхто ня тушыць. Мы перабягаем ноў у вёску. Стаіць атрад коньніцы і чакае пакуль згарыць мост. Яны скажалі, калі хоць адзін чалавек падыдзе да мосту, дык зараз-жа запальваюць усю вёску.

Пясочна гарэла ўвесь дзень.

Зьявілася чырвонаармейская разьведка. Сеўшы на фурманку з трыма чырвонаармейцамі, я паехаў уперад на фальваркі. У адным фальварку ўдалося выкрыць аднаго легіянэра, які пераапрануўся у гаспадарскае адзеньне і вышаў працаваць.

З вёскі Восава з запіскаю камісара палка я накіраваўся ў м. Магільнае, дзе прыняў удзел у арганізацыі рэўкому.

Пры дапамозе камісара (здаецца 8 дывізіі) Рэўком быў сфармаваны і на мяне усклаўзны былі абавязкі заг. аддзелам Нарасьветы і вал. ваенкома.

Песачанская група неяк скора распалася. А Сьвінкаўская група партызан цалкам накіравана была ў г. Нясьвіж у атрад па барацьбе з дэзэртырамі.

## Цэнтральнае ўпраўленьне лесаўпарадкаваньня

**Магілеў.** (Уласны кар.). Ужо ў 1926 годзе ў Магілеўскім акрэа ўтворана цэнтральнае ўпраўленьне лесаўпарадкаваньня. Гэта ўпраўленьне ў 1927 годзе ўжо ажыцьцявіла ўсе мерапрыемствы, якія ставіліся перад ім. Ужо ў 1927 годзе ўпраўленьне ўсталяваў 1.000 кілометраў лесаўпарадкаваньня, 1.000 кілометраў лесаўпарадкаваньня, 1.000 кілометраў лесаўпарадкаваньня,

# БУДАЎНІЧЫ СЭЗОН НАБЛІЖАЕЦЦА

## ПАЗБАВІМСЯ АД МІНУЛЫХ ПАМЫЛАК

Нізкая якасьць матар'ялаў, дарагоўля пабудоваў і канцылярская цяганіна значна перашкаджалі кватэрнаму будаўніцтву

### За плянавую і добраякасную пабудову

Кожны год у нас з наступленьнем вясны пачынаюцца вялікія будаўнічыя работы. Будуюцца нанава і рамантуюцца дамы, на фабрыках і заводах будуюцца новыя і перабудоўваюцца старыя карпусы, майстэрні і цэхі. На гэта будаўніцтва затрачваюцца вялікія сродкі. Між-тым да гэтага часу яшчэ нельга сказаць, каб якасьць нашых забудоў была зусім дасканалай.

Мясьц нямала прыкладаў недобраякасных пабудоў.

У мінулым годзе Белжылсаюз пабудаваў у рабочым пасёлку імя 1-га мая (Камароўка) дрыўляны дом на чатыры кватэры.

Ня насьпелі рабочыя ўвайсьці ў чыстыя, добрыя кватэркі, як інжынер паведаміў, што ўвесь дом заражаны грыбком.

Пачалася дыскусія паміж інжынерамі.

Адны выказаліся за тое, што дом ня трэба засяляць, яшчэ яго прадэзінфікаваць, іншыя гаварылі, што абсалютна засяліць і трымаць зачыненымі вокны і дзьверы. Такім чынам дом, на які патрацілі вялікія сродкі, у выніку застаўся на цэлую незаселеным.

Дом быў пабудаваны выключна з матар'ялаў Лесбелу.

Нізкая якасьць нашых пабудоў, у асаблівасьці, сталярных работ, затаемкіць ад нядобраякаснага матар'ялу. Але тут абвінавачваць шмога ня прыход іцца, бо пры нашым будаўнічым росьце поміт на лесаматар'ялы павышае прапановы; думаць тут аб тым, каб на некалькі год трымаць матар'ял на складах—ня прыход іцца.

Побач з нізкай якасьцю, наша будаўніцтва каштуе нам дорага.

Прычына гэтаму тая, што ў работнікаў нашых будаўнічых арганізацый адсутнічае пачуцьцё адказнасьці за выкананыя імі работы.

Усяму гэтаму трэба палажыць канец. Нашым будаўнічым арганізацыям трэба ў далейшым падцягнуцца ў сэнсе якасьці і патаньненьня шмага будаўніцтва.

А—н.

### 510 НОВЫХ ДАМОЎ—ЗА 4 ГАДЫ

#### Кватэрная каапэрацыя--на парозе новага сэзону

Разьвіцьцё будаўнічае каапэрацыі ў БССР пачалося ў 1925 годзе і, такім чынам, фактычна дзейнасьць кватэрна-будаўнічае каапэрацыі працякала на працягу двух з паловай будаўнічых сэзонаў.

Тэмп разьвіцьця будаўніцтва пасобных будаўнічых сэзонах характарызуецца наступнымі лічбамі:

У 1924 годзе былі пабудованы чатыры дамі з 8 кватэрамі; у 1925 г. пабудована і адноўлена 145 дамоў з 380 кватэрамі; у 1926 годзе—174 дамы з 450 кватэрамі, у 1927 г.—188 дамоў з 620 кватэрамі.

Усяго пабудавана і адноўлена 510 дамоў з 1.458 кватэрамі.

Такім чынам у 1926 годзе пабудованая кватэрная плошча павялічылася на 17 проц., у 1927 г.—на 41 проц.

Адначасова кватэрная каапэрацыя ўзьвялічила ў адноўленьні кватэрнага фонду, які быў зруйнован у часы грамадзянскай і імпэрыялістычнай войнаў.

У 1925 годзе было адноўлена 5 дамоў з 50 кватэрамі, у 1926—14 дамоў з 86 кватэрамі, у 1927 г.—9 дамоў з 57 кватэрамі.

Каапэрацыйнае будаўніцтва да 1927 году было пераважна драўляным. З мінулага году каапэрацыя пачала займацца і новым каменным будаўніцтвам. Удзельная вага каменнага будаўніцтва складае 18 проц. будаўніцтва і 1927 г.

Пераход на каменнае будаўніцтва наглядаецца ў гарадох—Менску, Гомелі, Віцебску і Барыйску. У іншых гарадох каменнаму будаўніцтву перашкаджае слабое разьвіцьцё цагельнае вытворчасьці.

Будаўніцтва 1927 г азначаецца таксама пераход м да пабудовы шматкватэрных дамоў. У драўляным будаўніцтве 1926 г. лік двухпавярховых дамоў складаў 0,6 проц. агульнага ліку пабудаваных памяшканьняў, у 1927 г.—1,9 проц. Колькасьць чатырохкватэрных дамоў павялічылася за год з 12,6 проц. да 25,9 проц.

У каменным будаўніцтве 1927 г.: дамоў чатырохкватэрных — 14,3 проц. і шматкватэрных — 71,4 проц.

На 1-га студзеня 1928 г. члены кватэрна-будаўнічай каапэрацыі атрымалі 1.212 кватэр. Трэба скончыць у булучым будаўнічым сезоне 46 дамоў, пабудова якіх пачалася ў мінулым годзе.

Кошт каапэрацыйнага будаўніцтва ў 1927 годзе складае 2.400.000 руб.—42 проц. агульнага рэспубліканскага кватэрнага будаўніцтва (за выключэньнем прыватнага будаўніцтва).

Аб чым гаворыць гэтыя лічбы?

На працягу будаўнічага сезону гэтага году трэба будзе пашырыць каменнае будаўніцтва, больш увагі ўдзяліць пабудове шматкватэрных дамоў.

Бон. Ш.

### Няма кантролю—няма толку

(ЖАКТ № 15/18).

Два гады ўжо існуе дзіцячы сад пры Жэкце № 15/18. У сярэднім у ім бывае 20 дзяцей у дзень. Праўленьне ЖАКТу зусім ня цікавіцца працай саду. З дня арганізацыі ня было ніводнай рэвізіі, і бацькі ня ведаюць, ці ўсе грошы, якія яны плацяць за дзяцей, ідуць у карысьць.

У сьнежні месяцы, калі новая культкамісія запатрабавала справаздачы ад загадчыцы сада, выявілася, што ніякага вучоту грошай і прадуктаў по відзецца.

Культкамісія прапанавала праўленьню ЖАКТу тэрміново зрабіць рэвізію дзіцячага саду. Прайшоў месяц—прапанова ня выканана. С. Б—ы.

### Адзінарныя ці падвойныя сьценкі

(Прапанова рабочага—будаўніка)

Адсутнасьць рабочых у вытворчых камісіях часта заслаяе тыя слабыя месцы, на якія трэба зьвярнуць належную ўвагу.

Белжылсаюз, які зьяўляецца непасрэдным арганізатарам новага будаўніцтва, робіць унутраныя сьценкі кватэр адзінарныя з дошак у 3 цалі і 2 цалі.

Паперша, такія сьценкі менш устойлівыя, падругое, яны каштуюць дорага і патрабуюць найлепшых дошак, якіх не хапае для сталярных работ.

Якую дошку вы-б не паставілі стойма на вышыні 5 аршын,—яна бязумоўна будзе хістацца.

Падвойныя-ж сьценкі (прускія)—куды лепш за адзінарныя—гэта ўсе будаўнікі скажуць. Яны робяцца з тонкіх дошак 2-га і 3-га гатункаў, ставяцца стойкі, па абодвых бакох яны абшываюцца дашкамі. Сьценкі ўжо не дадуць хістаньня, кошт іх зьменшаецца.

Зробім падлікі. Сьценкі з 3-цалёвак, якія ўжываліся ў 1926-м годзе, каштавалі 15 р. на 1 кв. саж. Сьценкі з 2-цалёвак у 1927-м годзе каштавалі 12 р. 06 к.

Падвойныя сьценкі, якія я прапаную, могуць каштаваць ня больш 8 р. 38 к. кв. саж. Такім чынам мы атрымаем 3 р. 68 к. эканоміі на кожны сажань—або 50 руб. эканоміі на кватэру.

Пры пабудове 70-80 кватэр атрымаем эканомію ў некалькі тысяч руб.

Я чакаю, каб рабочыя-будаўнікі і тэхнікі Белжылсаюзу выказаліся на старонках газэты наконт гэтага.

Ганцэвіч.

# ЗАГАТОЎКІ Ў БССР

### Што нам даў ударны месяц

Гэта быў сапраўды ўдарны месяц. Загатоўшчыкі ўсіх «рангаў» захваляваліся, заруха́ліся. Вышэйшыя рэгулюючыя органы рэспублікі прымусілі многіх загатоўшчыкаў прачнуцца ад сну... Далі ўдарную дырэктыву: узмацнеце загатоўкі, узмацнеце экспарт.

Якія-ж вынікі нам даў студзень месяц, ці маецца пералом (цяпер вельмі моднае слова)?

Няма сумненьня, што, дзякуючы націску вышэйшых органаў, загатоўчыя арганізацыі пачалі бліжэй і глыбей прыглядацца да таго, што робіцца на рынку, сталі падводзіць вынікі, якія аказаліся вельмі сумнымі.

Усюды недахопы, шурпатасьці, канкуранцыя, дэзарганізатарская работа прыватніка і г. д. і г. д.

У нашых загатоўках было выяўлена вельмі многа недарэчнага, дзікага. Знайшоўся багаты матар'ял для фэльетонаў на «загатоўчыя» тэмы...

Многія яшчэ не навучыліся загатаўляць, многія да гэтага часу не ўявілі сабе ўсю важнасьць і сур'ёзнасьць экспарту. Мы маем такія выпадкі: працаўнік дзяржаўнай ўстановы выяжджае з Плешчаніц у Лагойск за сырцом, а РВК арыштоўвае яго сумесна з сырцом. І для гвальненьня працаўніка патрабуецца распараджэньне рэгулючых органаў.

Бярэзінскі РВК, марачы аб пабудове ўласных смалакураных заводаў, пакуль што, каб упікнуць «канкурэнцыі», зачыняе і апячатвае два існуючыя смалакураныя катлы. І ўласьнікі гэтых катлоў, якія па дагаворы давалі шпітунар і смалу дзяржарганізацыі, пазбаўляюцца мажлівасьці загатаўляць смалапрадукты. Патрабуецца нажым акругандлю для таго, каб гэтыя катлы змаглі зноў пачаць працу.

Але адначасова з гэтым трэба ўсё-ж такі прызнаць, што загатоўкі зрушаны з мёртвага пункту, працаўнікі падцягнуліся і пачалі сур'ёзней адносіцца да загатовак.

Студзень месяц даў усё-ж такі, параўнальна з мінулым, значны прыхэт загатовак. На рынку зьявілася валакно, лён, кудзеля і інш. Белдзяржгандаль, у першую чаргу забясьпечваючы мясцовую прамысловасьць, змог выканаць экспартны плян на студзень.

Кожны дзень адпраўляюцца грузы для экспарту: валакно, шчаціна, грыбы, конскі волас, скурсырэц і г. д. З кожным днём выяўляюцца ўсё новыя і новыя віды экспарту.

Толькі гэтымі днямі пасланы за мяжу значныя партыі яблычнага пюрэ, павідла, сушаных яблык (прадукцыя Мазырскага камунальнага трасту).

Значныя партыі яйц у студзені адгружаны ва Францыю. У канцы студзеня экспартавана вялікая партыя свежай рыбы ў Варшаву.

Загатоўкі, экспарт узмацняюцца. Але ўмовы работы ўсё-ж застаюцца цяжкімі. Тыя ці іншыя нізавыя органы ўмешваюцца ў працу, тармазяць справу экспарту.

Неабходна яшчэ і яшчэ раз растлумачыць нізавым органам усю важнасьць і значэньне экспарту ў нашай гаспадарцы, трэба больш папулярызаваць ролю экспарту ў вёсках, РВК і сельсаветах.

Леўскі.

### Хто перашкаджае прасоўваньню прамтавараў на вёску

На пасяджэньні прэзыдыуму Менскай АКК-РСІ быў заслухан даклад менскага акруговага інспэктара гандлю тав. Данішэўскага аб ходзе прасоўваньня прамысловых тавараў на вёску.

Тав. Данішэўскі паказаў на тое, што ў гэтай справе ёсьць даволі значныя скажэньні: затрымка ў дасылцы прамтавараў на раёны, наяўнасьць фармальных адносін да справы прасоўваньня на вёску прамтавараў (мануфактуры, швейных машын і інш.) з боку Белкаапсаюзу, Тэкстыльгандлю.

Быў такі факт, калі да 10-ці дзён ляжалі на складах Тэкстыльгандлю тавары, прызначаныя для адпраўкі на вёску.

Прэзыдыум АКК-РСІ адзначыў, што паміж Белкаапсаюзам і Тэкстыльгандлем ня маецца поўнай увязкі ў справе прасоўваньня прамтавараў на вёску, адсутнічае належная сур'ёзнасьць да гэтай справы з боку паказаных арганізацый.

Белкаапсаюзам ня было прынята належных мер для свячасовай рэалізацыі мануфактуры, прызначанай для вясковых спажывецкіх таварыстваў.

З боку Белсельсаюзу ня было прынята выстарчальных мер да прасоўваньня швейных машын на вёску.

Фракцыі Белкаапсаюзу пастаўлены на від недапушчальныя адносіны і нядбайнасьць у наглядзе за свячасовай рэалізацыяй прамтавараў на вёсцы, фармальныя адносіны да крэдытаваньня спажывецкіх таварыстваў.

Тэкстыльгандлю ў асобе загадчыка тав. Рубенчыка ўказана на непрыняцьце адпаведных мер да рэалізацыі прамтавараў на вёсцы.

Таксама прапанована Белсельсаюзу прыняць меры да хутчэйшага прасоўваньня на вёску швейных машын і дакладнага вучоту ў рэалізацыі тавараў, якія прызначаны для вёскі.

### Ненармальнасьці ў загатоўках на Віцебшчыне

ВІЦЕБСК (Уласны кар.). ўАбсьледваньне некаторых раёнаў Віцебшчыны паказала, што, хоць у тэмпе загатоўчай работы наогул прыкметны значны зрух, але ўсё-ж яшчэ не ліквідаваны многія ненармальнасьці ў загатоўчай працы.

Напрыклад, у Гарадокскім і Бешанковіцкім раёнах есьць шмат загатоўшчыкаў сырцу, і вожны з іх лічыць сваім абавязкам прыцягнуць златчыка на свой бок, адцягваючы яго ад іншых дзяржаўных-жа арганізацый.

Белдзяржгандаль перацягвае спэцаў з сельсаюзу да сябе на службу, прапануючы ім большую пэнсію і г. д.

Усё гэта ў канчатковым выніку кепска адбіваецца на загатоўках.

Вялікім тормазам у загатоўцы ільну і ільнянога семя зьяўляецца недахват дэфіцытных тавараў на мясцох.

Але, ня гледзячы на ўсе гэтыя ненармальнасьці, загатоўчая праца ў Віцебшчыне, асабліва па лініі сельска-гаспадарчай каапэрацыі, з кожным днём узмацняецца, і пляны, па ўсіх даных, будуць выкананы.

### Больш энэргіі

МАЗЫР. (Уласны кар.). Загатоўчая праца на Мазыршчыне некалькі разгарнулася. Весткі з месц, якія ёсьць, гавораць аб тым, што за 20 дзён студзеня месяца загатоўлена амаль што столькі-ж, сколькі за ўвесь першы квартал.

Але ў самай загатоўчай рабоце ёсьць рад перашкод і недахопаў. Між іншым, мы назіраем недастатковае авансаваньне нізавое каапэрацыйнае сеткі з боку акруговых цэнтраў, што шкодзіць загатоўкам.

Галоўным-жа недахопам зьяўляецца слабая арганізацыя мясного рынку, на якім прыватнік займае яшчэ значнае месца. Апошняе падтрымліваецца наступнымі лічбамі: па г. Мазыры за першы квартал каапэрацыяй забіта буйное жывёлы—352 шт., прыватнікамі—580 шт., дробнай жывёлы-каапэрацыяй—24, прыватнікамі—522 штукі.

Такое становішча назіраецца ў цэлым радзе раёнаў за выключэньнем Петрыкава, дзе рынак у большасьці абхоплен каапэрацыяй.

Трэба правесьці энэргічную барацьбу за арганізацыю загатовак і за паступовае выпіханьне прыватніка з рынку.

Б. Ш.

### Аслабленьне загатовак на Случчыне

(Па тэлефону ад нашага бабруйскага карэспандэнта)

За шостую пяцідзёўку студзеня па Бабруйскай акрузе загатоўлена 18.000 пуд. збожжа і 1.300 пуд. ільнянога семя.

У шэрагу раёнаў наглядаецца ажыўленьне загатоўчай працы.

Зусім іншае—у Слуцкім раёне. Тут хлебазагатоўкі за шостую пяцідзёўку студзеня зьнізіліся ў параўнаньні з пятай пяцідзёўкай (шостая пяцідзёўка дала 5.755 п., а пятая—7.442 п.).

У мэтах узмацненьня загатовак зараз вырашаецца пытаньне аб накіраваньні ў больш адсталыя месцы с.-г. машын і іншых тавараў. Бабруйск атрымаў зараз 76 швейных машын, якія накіроўваюцца на вёску.

Увогуле па ўсёй Бабруйскай акрузе загатоўкі ў 6-ай пяцідзёўцы студзеня раўняюцца загатоўкам пятай пяцідзёўкі гэтага месяца.

### З мясазагатоўкамі ня ўсё добра

Плян мясазагатовак па БССР у першым квартале (па папярэдніх вестках) выкананы толькі на 57,7 проц.—усяго загатоўлена 3.339,6 тон замест устаноўленых 5.784 тон.

Удзельная вага асноўных мясазагатоўшчыкаў на мясным рынку застаецца невыстарчальнай.

Плян здаваленьня гарадоў мясам за першы квартал выканан на 59,3 проц.

Гэтыя лічбы гавораць аб тым, што мясны рынак на Беларусі слаба ахоплен хаджаўнымі і каапэрацыйнымі арганізацыямі.

Дырэктыва Эканомнарады аб зьніжэньні загатоўчай цаны на мяса на 5 проц., па параўнаньні з мінулым годам, у першым квартале ня выканана.

Замест гэтага мы маем павышэньне цэн за выключэньнем Бабруйскай акругі, дзе ёсьць зьніжэньне цэн на 6,2 проц.

Якія асн ўныя прычыны гэтай нездавальняючай працы па мясазагатоўках.

Паміма аб'ектыўных умоў—слабага выкіданьня сялянамі жывёлы на рынак з прычыны добрага ўраджаю—мы тут маем слабае кіраўніцтва мясозагатоўкамі з боку каапэрацыйных цэнтраў, слабую падрыхтоўку загатоўчага апарату, адсутнасьць добра кваліфікаваных працаўнікоў па мясной справе. Н.

### Пасеўкампанія ў Гомельшчыне

У акрузе прадугледжваецца загатовіць 3.990 пуд. насеньня канюшыны, 1870 п. вікі, 190 п. сарэдэлі і 740 п. лубіну.

Акрамя гэтага будзе завезена 12330 пуд. вікі, 810 п. сарэдэлы, 9440 п. лубіну, 349 п., коральхладаў і 5800 п. ільну-даўгунцу.

Унутры акругі будзе загатоўлена каля 12—15 тыс. п. сартовага аўсу, акрамя гэтага прадугледжваецца завезьці ў акругу з другіх месц да 20.000 п. палепшанага простага аўсу.

Збожжаачышчальная кампанія па прыкладзе мінулых гадоў будзе праводзіцца дармова. Усяго намячаецца адсартаваць 240.000 п. насеўнага збожжа і пратравіць 15900 п.

На акрузе будзе праведзен насеў радавымі сеялкамі на плошчы 2493 дз., шэрагамі крадытаваньня сялянам будзе раздана 20.000 п. розных мінеральных угнаеньняў.

У мэтах забясьпечаньня бяднейшага насельніцтва простым насеўным матар'ялам намячаецца водпуск 35 тыс. руб. крэдыту бедняком.

М.

# Матар'яльная адказнасьць за парушэньні законаў аб працы

**Патрэбнасьць прыняцьця закону аб матар'яльнай адказнасьці працаўнікоў за парушэньні кодэксу законаў аб працы—даволі высьветлена. Неабходна законадаўчая ініцыятыва.**

Часта ў нашым друку і на сходах рабочых і служачых перад прадстаўнікамі РСІ ставяцца запытаньні аб тым, чаму ў нашай практыцы за розныя парушэньні, у асаблівасьці за парушэньні закону аб працы, што мае асабліва шырокае распаўсюджаньне, матар'яльную адказнасьць нясе ўстанова ці прадпрыемства, а ня той работнік, які учыніў гэтае парушэньне.

Запраўды, ці ня маюць нейкую хібнасьць гэтыя непаразуменьні і незадаволенне працоўных? Па зусім ня ўмелай лёгіцы рэжыму эканоміі і з пункту погляду інтарэсаў пралетарскае дзяржавы, як яшчэ, зусім яскрава, што дзяржава ня можа несьці адказнасьці за тое, што выключна па сваёй віне зрабіў яе прыганяты.

Мы добра ведаем сотні выпадкаў, калі нават не ў параўнаньні якіх-небудзь спрачак альбо абмытванасьці і складанага тлумачэньня закону, а выключна на падставе грубейшага і відавочнага парушэньня закону з боку адміністратара, для якога ці закон ня пісан, ці закон заважыць ад яго адміністратарскага ўгледжаньня, — выплачваецца, ці лепей сказаць,—марна трацяцца шмат сродкаў, даходзячых да вялікіх лічбаў.

Сродкі, выплачаныя за гэтак званы «прымусовы прагул» па віне адміністратара, кладуцца цяжкім цяжарам на ўстанову ці прадпрыемства. Гэта зьяўляецца ва ўсіх выпадках вялікім парушэньнем бюджэтнае дысцыпліны, калі ўстанове прыходзіцца за грахі кагосьці з сродкаў на вытворчыя патрэбы вышукваць крыніцу аплаты на прысудзе працэсіі. Крыніцы, якія нікім каштарысам або бюджэтам не прадугледжваюцца.

Калі працавыць за год, два гады, колькі ў гэтым парадку выплачана дарэмна сродкаў,—дык вось чаму ўсякі скажа, што гэтаму выкіданьню грошай на вецер павінна быць пакладзен канец.

Закон, які-б ускладаў адказнасьць за выплату «прымусовага прагулу» на адміністратараў, быў-бы для апошніх добрай уздоўю. Ён-бы ўгамываў многіх жвавых у цяперашні час адносінаў да таго, каб ня лічыцца з законам аб працы. Усякі перш, чым пайсьці на нарушэньне закону, падумаў-бы аб небясьпецы, якая яму непасрэдна пагражала-б ад свайго свавольства.

Гэты закон таксама павінен прыпасьці вялікую карысьць у тым, што ўсе адміністратары добра вывучаць усе законадаўствы аб працы, якога ў сучасны момант дорыць часта ня ведаюць.

Гэты закон таксама будзе адным з сродкаў, які больш, чым што другое, пакладзе канец так званаму суцяжніцтву, беспадстаўнаму ўзбуджэньню канфліктаў або зацягваньню шляхам абскаржаньня пастаноў першапачатковых тарыфна-канфліктных органаў, аб чым наш друк у сучасны момант уздымаў, па пачыне «Правды», кампанію.

У заключэньне нам трэба сказаць, што ўжо маючаяся практыка законадаўства ў іншых рэспубліках, як напрыклад, у РСФСР, дзе такі закон існуе з 27 г., паказвае, што ўсюды жыцьцё патрабуе ўстанаўленьня закону, які абараняе органы савецкай улады ад усялякіх аматараў спрачацца з нашым працоўным законадаўствам.

**Таму, выданьне такога закону—бясспрэчна. Вінаградаў**

# Пэрспэктывы ліквідацыі беспрацоўя

(Да пастаноў XV зьезду УсеКП(б)

15 зьезд УсеКП(б) у рэзалюцыях аб дырэктывах па складаньні пяцігадовага пляну народнае гаспадаркі дакладна вызначыў тыя шляхі, па якіх у асноўным трэба ліквідаваць наша беспрацоўе і яго асноўную і важнейшую крыніцу—аграрную перанаселенасьць.

... „Разьвіцьцё працаёмкіх культур у вёсцы, інтэнсыфікацыя і індустрыялізацыя сельскае гаспадаркі ня ўхільна будуць паглынаць растучую колькасьць рабочых рук, тады як пашырэньне індустрыі, асабліва на асноове зьмяншэньня рабочага дня і ўвядзеньня большага ліку зьмен, будзе больш шпарка рассасваць беспрацоўе ў гарадох".

Зусім ясна. Бо абмежавацца мерапрыемствамі рассасваньня беспрацоўя ў гарадох, нават пры ўмовах нашага шпаркага гаспадарчага росту, было-б на меншай мэрэ памылкаю, а то і поўным неразуменьнем гэтай складанейшай сацыяльнай і гаспадарчай праблемы нашых дзён. Для таго, каб нашы гаспадарчыя мерапрыемствы далі патрэбныя вынікі, неабходна спыніць беспрацоўе ў яго корані, г. зн. у вёсцы. А для гэтага неабходна «разьвіцьцё працаёмкіх культур у вёсцы, інтэнсыфікацыя і індустрыялізацыя сельскае гаспадаркі».

Гэта становішча ў найбольшай ступені адносіцца да БССР, дзе аграрная перанаселенасьць зьяўляецца досыць высокай і, у моц цэлага ряду прычын, мацней, чым у іншым месцы, націскае на гарадзкое беспрацоўе і ўсё наша гаспадарчае жыцьцё.

... „Найбольш істотнай праблемай у народнай гаспадарцы БССР, вырашэньне якой патрабуе яшчэ ня толькі пяці год, але і ряду гадоў пасьля 1932 году, зьяўляецца праблема перанасяленьня і выкарыстаньня працоўных рэсурсаў у розных галінах гаспдаркі".

(Матар'ялы Дзяржплану. XVI стар.).

Вось такую ацэнку праблемы перанасяленьня і выкарыстаньня працоўных рэсурсаў даў Дзяржплян БССР. Ацэнка гэта бязумоўна правільная.

Для таго, каб зьмякчыць гэта становішча, паводле пяцігадовага пляну прадугледжваецца перасяліць 382.600 чалавек у іншыя раёны Саюзу ССР. Апрача таго, у выніку мерапрыемстваў па маліярацыі і культур-тэхніцы, плошча ральлі павінна павялічыцца на 40 тысяч дзесяцін і сенажаці на 265 тысяч. Да канца пяцігодкі ў асноўным павінна закончыцца земляўпарадкаваньне.

Правядзеньне вышэй памянёных мерапрыемстваў, а таксама ўзмацненьне інтэнсыфікацыі і разьвіцьцё працаёмкіх культур (гародніцтва, садоўніцтва) павінны выканаць асноўную задачу—спыніць крыніцу беспрацоўя ў вёсцы.

Усе гэтыя мерапрыемствы пры наяўнасьні вялікай увагі з боку партыйных і урадовых органаў могуць быць ажыцьцёўлены, але патрэбна яшчэ ўзмацненьне ўвагі мясцовых органаў да справы прыцягненьня сродкаў самога насельніцтва для гэтай-жа мэты.

Думка аб тым, быццам-бы адным-толькі мерапрыемствамі па інтэнсыфікацыі сельскае гаспадаркі і індустрыялізацыяй мы зможам ліквідаваць беспрацоўе ў БССР,—зьяўляецца памылковай. Гэтыя мерапрыемствы зьяўляюцца асноўнымі, але не адзінымі.

У нашых умовах БССР, вельмі важную ролю можа і павінна адыграць саматужная прамысловасьць і промыслы. Нажаль, да гэтага часу работа разгортваецца вельмі марудна і таму дае сябе адчуваць націск местачковага насельніцтва на нашы біржы працы ў гарадох. Вялікае практычнае значэньне ў сэнсе зьмякчэньня вострасьці беспрацоўя і зьмяншэньне націску на буйныя гарады, будуць мець таксама тыя мерапрыемствы, якія ўжываюцца ў адносінах гаспадарчага ўпарадкаваньня мястэчак. (Пост. СНК ад 24-I г. г.).

Правядзеньне ўсіх гэтых мерапрыемстваў павінна павялічыць патрэбнасьць у колькасьці затрачваемае працы як на сельска-гаспадарчыя работы, так і на неземляробчыя заняткі на 13,9 проц. Усе-ж, ня гледзячы на гэта, лішкі працы земляробчага насельніцтва ў БССР ня будуць зжыты, а колькасьць зьменшацца в 18,5 проц. у 1926-1927 г. да 12,8 проц. у 1931-32 годзе ў адносінах да ўсяго запасу працы.

Як бачым, аграрная перанаселенасьць к канцу пяцігодкі павінна ў значнай меры зьмякчыцца, тым больш, калі прыняць пад увагу разгортваньне будаўнічых і шляхавых работ (чыгуначных шляхоў і шашы), на якіх у значным ліку працае сельскае насельніцтва (чорнарабочая сіла і адходныя промыслы).

Гарадзкое беспрацоўе, наадварот, мае тэндэнцыю да росту і ў працягу бліжэйшае пяцігодкі, як відаць, застанецца напружаным.

На працягу пяцігодкі намяркуецца ўцягнуць у прамысловасьць і іншыя галіны народнае гаспадаркі да 30.000 новых работ., а рост запасаў працы ў гарадох прадугледжваецца, разам з прыпушчанымі з вёскі, да 95.000. Такі чынам, выходзіць, што у нас да канца пяцігодкі павінна быць 55-65 тыс. беспрацоўных у гарадох. Гэта пэрспэктыва ставіць перад намі ва ўвесь рост гату задачу на разьвязаньне.

Паводле нашых даных і меркаваньняў прамысловасьць павінна ўцягнуць больш прадугледжанае колькасьці рабочых прыблізна на 5 тысяч чалавек (11-12 проц. агульнае колькасьці рабочых у прамысловасьці да канца пяцігодкі) у зьвязку з пераводам некаторых фабрык і заводаў на скарочаны 7-гадзінны рабочы дзень і ўвядзеньнем у зьвязку з гэтым большае колькасьці зьмен.

Дзякуючы значнаму паляпшэньню забясьпечаньня старых (захаваньне сяброўства заработку) ствараецца магчымасьць у працягу бліжэйшае пяцігодкі перавесьці ня менш 3-4 тысяч гэтых рабочых на пэнсію і замест іх паставіць на работу маладых рабочых. Гэта мерапрыемства бязумоўна рэальнае і прынясе вялікую карысьць нашай народнай гаспадарцы. Такім чынам, прыблізна 40 тысяч чалавек павінны быць уцягнуты ва ўсе галіны нашае прамысловасьці, як сталая рабочая сіла. Астатнюю колькасьць беспрацоўных у 55 т. чал. праектуецца выкарыстаць наступным чынам. Да 12 тыс. чалавек—у працкалектывах, лічачы, што рост іх застанецца на ўзроўні 1926-27 г. Пры правядзеньні зьмяняемасьці толькі 50 проц., можа быць ахоплена гэтым відам працоўнае дапамогі да 18 тысяч чалавек. Улічваючы, што сярэдняя зарплата ў працкалектывах ніжэй сярэдняй нармальнай зарплаты на 7-8 проц., трэба прызнаць гэты від дапамогі самым істотным і працуючых у працкалектывах на становішчы паўпрацуючых.

Рэшту беспрацоўных прадугледжваецца ахапіць іншымі відамі працоўнае дапамогі: грамадзкія работы, перакваліфікацыя і аказаньне дапамогі пры пераездах у другія раёны Саюзу ССР. (За мінулы 1926-27 год выехала з межаў БССР толькі праз біржы працы 3 тыс. чалавек). Трэба думаць, што ў зьвязку з вялікім ростам прамысловасьці і транспарту ў іншых раёнах Саюзу, пераезд яшчэ больш узмоцніцца. Такое зьвяшча зусім нармальнае, бо рост прамысловасьці ў БССР, у зьвязку з адсутнасьцю выстарчальнай базы, будзе разьвівацца павольней, як у іншых раёнах Саюзу ССР (Днепрастрой, Сямірічанская чыгунка, Волга-Дон канал, машынабудаўнічыя і мэталюргічныя заводы на Поўдні, Паўдзёвым Усходзе, Урале і інш.).

І апошняе мерапрыемства, якое мы прымушаны будзем ужыць у працягу гэтага пяцігодзьдзя,—гэта выдача дапамогі з страхкас.

У заключэньне трэба адзначыць, што гэта пяцігодка зьяўляецца найбольш яспрыяючай у адносінах беспрацоўя. Усе буйныя пабудовы, якія пасьля сканчэньня могуць увабраць дзесяткі тысяч рабочых, будуць скончаны толькі к канцу пяцігодкі і тады толькі мы адчуем шпаркае рассасваньне беспрацоўя ў гарадох.

Неабходна таксама агаварыцца, што ўсе паданыя тут меркаваньні зьяўляюцца прыблізнымі і арыентовачнымі, якім яшчэ патрэбны ўдакладненьні і дапаткі. Усё гэта будзе зроблена толькі пры канчатковым складаньні балянсу працы і пяцігадовага пляну разьвіцьця народнае гаспадаркі БССР.

Банэр.

# Перад адкрытым сэмафорам

(На сходзе чыгуначнікаў Менскага вузла МБЖ чыг.)

Бель пушыстая, сьветлая асьнежыла сталёвыя рэйкі, запарушыла чыгунныя колы нярухомых вагонаў. Віхуры пераблыталі ланцужкі агнёў на стрэлках, занесьлі трухлявыя сьцежкі ў клюбы.

Але да 7-мі гадзін сьцежкі зноў пратанталі людзі, зноў па іх пайшлі з дэпо, з дзяжурак і брыгад. А яшчэ крыху пазьней з Завальскай, Кандуктарскай, Сураскай вуліц, якія прымыкаюць да клюбу,—прыйшлі жонкі рабочых.

У файе клюбу сярод махорачнага дыму фабзайцы з МШУ, сьлесары, машыністы, кавалі, змазчыкі.

Сход адкрыўся. Проста па-дзелавому тав. Чарвякоў паведаў сходу аб выніках 15-га партъезду.

— Усе пастановы нашай партыі,—сказаў ён,—будуць праведзены ў жыцьцё толькі тады, калі іх будзе ведаць і ўсьвядоміць уся рабочая кляса.

— Тое, што мы перайшлі ад аднаўленьня нашай гаспадаркі да яе рэканструкцыі, тое, што мы ідзем па шляху індустрыялізацыі, сьведчыць аб нашых посьпехах.

Таварыш Чарвякоў падрабязна спыніўся на пытаньні **рацыяналізацыі нашай прамысловасьці.**

Слова «рацыяналізацыя», хвалюе шмат каго. Многія думаюць, што за рацыяналізацыяй хаваецца тое страшаннае, што называецца скарачэньнем. Шмат хто разумее рацыяналізацыю толькі, як скарачэньне, і больш нічога...

Трэа ведаць, што гэта важнейшае мерапрыемства партыі і савецкае ўлады, якое выцякае з агульнай задачы індустрыялізацыі краіны, ня толькі не пагоршыць, але наадварот, паленшыць становішча рабочых.

Праз рацыяналізацыю мы дабіваемся палепшаньня якасьці, патаненьня сабекошту, павялічэньня ліку тавараў і паляпшэньня становішча рабочых. Мы праводзім рацыяналізацыю шляхам пабудовы новых прадпрыемстваў, лепшай арганізацыі працы, яе інтэнсыфікацыі.

Вялікай «прарэхай» у нашым сацыялістычным будаўніцтве зьяўляецца дарагоўля нашага капітальна будаўніцтва. Гэта цяпер актуальнейшае пытаньне.

Тав. Чарвякоў прывёў цікавы факт: яму прышлося ў Лепелі гутарыць з маладым інжынэрам, які будаваў казарму. Дык вось гэты інжынэр пабудаваў казарму з сырога матар'ялу, потым паштукатурыў сьцены і пакрыў іх алейнай фарбай. Зімой, як трэба было чакаць, штукатурка асыпалася. На запытаньне тав. Чарвякова—ці-ж інжынэр ня ведаў аб тым, што штукатурка абваліцца, малады спэцыялісты адка аў: гэта быў толькі **вопыт.** Дык вось дзякуючы такім вопытам нашае будаўніцтва каштуе вельмі дорага.

* * *

Тую некрапутую цаліну дзедаўскіх адвечных балот, тую бытавую лямку вёскі, простую і жудасную, нарэшце, некультурнасьць сялянства мы зможам перамагчы толькі **калектывізацыяй вёскі.**

Тав. Чарвякоў многа гаварыў у сваім дакладзе аб вёсцы, аб новай культурнай... Ён намаляваў выдатнейшыя ўзоры тэй сацыялістычнай будучыні ўсяе вёскі, якую нясе калектывізацыя.

* * *

У сваім дакладзе тав. Чарвякоў ахарактарызаваў задачы культурнай рэвалюцыі, да якое мы зараз падыйшлі, спыніўся на пытаньні аб апазыцыі.

Сходам прынята рэзалюцыя, у якой гаворыцца аб тым, што рабочая кляса будзе праводзіць у жыцьцё ўсе пастановы партыі.

Заціх клюб. Гулялі толькі сьнегавыя завеі па рэйках, вагонах і цягнікох.

А. Ц.

# У ІНБЕЛКУЛЬЦЕ

## Папаўненьне акадэмічнае рады ІБК

У склад акадэмічнае рады даабраны наступныя асобы: праф. Дурново, проф. Фядзюшын і Сосіс, а ўсяго ў радзе 27 чалавек.

## Камандыроўка Яззэпа Лёсіка

Аддзел гуманітарных навук ІБК камандыраваў члена Інбелькульту Л. Лёсіка ў Кіеў для азнаямленьня з пастаноўкаю справы вывучэньня мовы ў украінскай акадэміі навук.

## Лінгвістычная геаграфія Беларусі

Праф. Бузук падрыхтаваў да друку лінгвістычную геаграфію Беларусі, якая будзе ілюстравана 20-цю картамі. Гэтая праца будзе вельмі каштоўнаю для вывучэньня дыялектаў Беларусі і паасобных моўных зьяў.

## Справаздачы аб навуковых камандыроўках

Рада аддзелу прыроды і гаспадаркі заслухала справаздачы аб навуковых камандыроўках сваіх сяброў, а імянна: д-ра Трамповіча ў Біялёгічную лябараторыю камуністычнай акадэміі і іншыя ўстановы на экспэрымэнтальнай біялёгіі, старшага хэміка Вяртука, які вывучаў пастаноўку справы хэмічных навукова-дасьледчых інстытутаў Масквы, і прыкамандыраванага да геафаку Ленінградзкага унівэрсытэту т. Азбукіна аб яго працы за мінулы сэмэстр.

## Музэй прамысловасьці

Рада аддзелу прыроды і гаспадаркі са згоды Ленінскага дасьледчага інстытуту пастанавіла выкарыстаць для зьмяшчэньня сваіх калекцый па прамысловасьці, якія лягуць у аснову прамысловага музэю ІБК, памяшканьне ў будынку Ленінскага інстытуту сумесна з навуковым музэем сельскае гаспадаркі.

## Прылады каменнага веку

Селянін з сяла Прысна, Беткаўскага раёну, І. М. Глухаў прыслаў у археялёгічную камісію цікавую калекцыю рэчаў каменнага і бронзавага вякоў. Гэтыя рэчы знойдзены ім на ўсход ад сяла Прысна на месцы вялікай палеалітычнай стаянкі, якая была вынуждена экспэдыцыяй Інбелькульту ў 1926 годзе.

Калекцыя складаецца з крамянёвых нажоў, астрыёў на стрэлкі (для страляньня з луку), праколак, сьвердзёлкаў і інш.

Гэтыя рэчы вызначаюцца сваёю дужа незначнаю велічынёю (2—4 сантыметры даўжыні). У большасьці выпадкаў на іх заўважваецца суцэльная апрацоўка паверхні.

# КІНО

## „6-ая частка сьвету"

(Кіно „Прапетары")

Урэшце гэты фільм дакаціўся і да нас. Лепш позна, чым ніколі...

„6-ая частка сьвету"—гэта фільм аб СССР, пабудаваны выключна на фактах, Людзі і рэчы ўзяты ў іх рэальных і бытавых узаемадносінах. Кожны малюнак—кавалак сапраўднага жыцьця.

Так звычайна будуюцца кіно-хронікі. Але даны фільм не зьяўляецца кіно-хронікай, бо ў ім ня проста асобныя факты з указаньнем часу і месца, а зьявішча, падпачаленыя агульнай тэме. З кожнага зьявішча ўзята толькі тое, што патыходзіла для тэмы.

Аднак „6-ая частка сьвету" не зьяўляецца і гэтак званай „мастацкай" карцінай. Карыстаньне выключна „нігравым" матар'ялам прымушала ўжываць асаблівыя методы апрацоўкі фільму, якія ня ўжываюцца ў мастацкай кінематаграфіі. Адсутнасьць інтрыгі, мантажная апрацоўка здымкаў робяць гэты фільм зусім своеасаблівым зьявішчам, якое адрозьніваецца ад звычайных фільмаў.

„6-ая частка сьвету" гэта тып фільму, у якім матар'ял-хроніка апрацаваны асаблівым мантажным спосабам.

Вытворчасьць гэткіх фільмаў адчыняе перад нашай кінематаграфіяй новыя магчымасьці. Мэтад Дзігі Вертава (пастаноўшчыка „6-ай часткі сьвету") даваляе перакладаць на мову кіно такія рэчы, якія раней не падаваліся кінематаграфічнай апрацоўцы. Такі мэтад даваляе з дакумантальных здымкаў будаваць фільмы на палітычную і гаспадарчую тэму.

Але для гэтага патрэбна вялікая колькасьць „сырцу"—матар'ялу хронікі на закранутым пытаньні. Нават і ў „6-й частцы сьвету" адчуваецца недахват матар'ялу. Каб гэтага ўнікнуць, неабходна своячасова рабіць здымкі і стварыць нешта падобнае на архіў.

Гэта павінны мець на ўвазе ўсе саветскія кіно-арганізацыі і ў прыватнасьці наша Беларкіно.

У адносінах да Беларкіно прыхо'дзіцца сумляецца ў магчымасьці стварэньня калісьці фільму, падобнага фільму Вертава. Прычынай гэтага зьяўляецца слабая пастаноўка справы са здымкамі кіно-хронікі, якой Беларкіно не ўдаляла адпаведнай увагі.

Прыдзе час, калі неабходна будзе паказаць на нашым экране мінулае, і гэтага немагчыма будзе зрабіць за адсутнасьцю „сырцу". Аб гэтым павінна памятаць Беларкіно і прыняць неабходныя крокі ў напрамку пастаноўкі справы кіно-хронікі на належную вышыню.

## „Хто ты такі?"

(Кіно „Культура")

Гэты фільм „Межрабпом-Руси" пабудаваны на сюжэце твору Джека Лондана „По той бок шчыціны". Даных, каб зрабіць цікавы фільм, адным словам, хапала.

Што-ж паказвае карціна?

Малады прафэсар сашыхае рыхлае твор, у якім атрымае за мірнае сумяшчэньне працы і капіталу. За гэта ўзнена кацуны, ён і атрымлівае ад буржуазнага вучонага сьвету і капіталістых годнасьць прафэсара.

Праз некаторы час, аднак, прафэсар ратае и верыць сваю тэорыю ў жыцьці і паступае на фабрыку рабочым. Тут ён паступова ўпэўніваецца ў тым, што погляды, якія ён выяўляў у сваім творы, зусім памылковы.

Такая ацэнка сюжэту. Здаецца-б, што на ёй магчыма пабудаваць фільм-сатыру па сучасную буржуазную грамадзкасьць. Кіно-арганізацыя „Межрабпом-Русь" пайшла на другім шляху, штучна зьвязаўшы ідэялёгічны бок справы з камэрцыйным. Так напрыклад, мы бачым у фільме амэрыканскі завод, упіск рабочых, забастоўку, штрэйкбрэхэраў, жлікоў, баранцьбітоў за рабочую справу. Вось, гэтак званая, порцыя ідэялёгіі.

Але порцыя камэрцыі значна пераважае ўсу тое, што мае ў карціне сацыяльнае значэньне. Ці мала выпіваюць спіртных напіткаў, выкаранных на найлепшых рэцэптах звычайных амэрыканскіх фільмаў? А авантурныя і эротыкі поўна карціны! На-што ён патрэбны быў?

„Межрабпом-Русь" пазіцыянуецца та самі тым, што ён прыхаваны, ідэя і культае з ідэялёгічнага боку, усё-ж мастацка і чыста зроблена. У даным выпадку і гэтага павінны мець на ўвазе.

Фільм не ўдаляе і мастацкай каштоўнасьці.

Карціна „Хто ты такі?" — мусіць чыста „камэрцыйная" прадукцыя з пункту погляду стварыўшай яе кіно-арганізацыі. І сапраўды яна мала чым адрозьніваецца ад гэткай жа маркі прадукцыі халіўудскіх кіно-ательэ. На вашу думку карціна і не камэрцыйны фільм.

Савецкае кіно ня шмат страціла-б калі-б не зьявіўся на свет міжрабпомаўскі „Хто ты такі?".

А.

# ●●● СУД ●●●

## Аграбленьне Бабчынскага каапэратыву

Шайка рабаўшчыкаў у асобе Паула Драчанкі, Міколы Нікіценкі і Грыгора Дашука задумала аграбіць Бабчынскі каапэратыў, Хойніцкага раёну.

Для гэтае мэты рабаўшчыкі склалі яўны план: наперадзе, патрэбна было зрабіць каапэратыўнага вартаўніка, якому даручана было ахоўваць каапэратыў ночу, падругое, каапэратыў супроць школы, значыць неабходна было растаўніць пасты, каб ня быць захопленымі ў краме зьнянацку і тром з гэтай задачай справіцца было трудна.

Усе гэтыя акалічнасьці злачынцы добра ўлічылі і абмеркавалі. Але аднаго бракавала: для выкананьня гэтага плану патрэбны былі дадаткова людзі. І вось гэтая тройка пачала падбіраць сабе кампанію. Ня раз яны раілісь, прыкідалі, прымяркоўвалі, уважаваліся людзі, іх пьвёрдасьць, здольнасьць стаіць ад людзкога вока злачынства, умець гладка спусьціць награбленае, а ў часе небясьпекі і ня выдаць „сваіх".

Выбар паў на Драчанку Х., Бандаранку М., Бардаку М. і Ляшчуку М. Такім чынам утварылася шайка ў 7 чалавек.

Узброіўшыся стрэльбамі, гэтыя рабаўшчыкі а 10 гадзіне ўвечары пад кіраўніцтвам тай-жа тройкі падыйшлі да ўмоўленага месца і прыступілі да выкананьня намечанага плану.

Пачалі ламаць замкі і падважваць ломам дзьверы. Пачуўшы каля крамы грукат, каапэратыўны вартаўнік Галезьнік пакіраваўся туды, але стрэлам з абрэзу быў забіты Нікіцінкаю Мікола.

З каапэратыву рабаўшчыкі забралі розлага тавару ў тым ліку і мануфактуры на 603 руб.

У вёсцы Чэхі ўсё награбленае было падзелена паміж злачынцамі. Некаторыя з іх сваю дзель схавалі ў гной, Драчанка Харытон сваю частку закапаў на могілках, а Бандаранка з сваім здабыткам а хругой гадзіне на поўначы вакіраваўся да свайго суседа Заяца і папрасіў узяць на схаваньне яго мануфактуру. Заяц адмовіўся і пачаў дапытвацца, адкуль ён узяў столькі мануфактуры. Бандаранка пад строгім сакрэтам расказаў пра аграбленьне каапэратыву.

Скора аб грабяжы ў Бабчыне даведалася ўся вёска і гэтая шайка зладзеяў была арыштавана.

Разглядала справу выязная сэсія Гомельскага акруговага суду ў м. Хойніках.

Главары шайкі зладзеяў Драчанка П., Нікіценка М. і Дашук Гр. прыгаворваны да расстрэлу, але па амністыі расстрэл ім заменены 10 гадамі зьняволеньня кожнаму з суровым адмежаваньнем.

Усе іншыя нахсудныя прыгавораны на розныя тэрміны пазбаўленьня волі.

Акрамя таго, усе яны за выключэньнем Ляшчука прызнаны сацыяльна-небясьпечным элементам для данай мясцовасьці і падлягаюць высяленьню з межаў Гомельскае і Мазырскае акругаў на розныя тэрміны з моманту адбыцьця кары.

Вярхоўны суд гэты прыгавор пакінуў у моцы.

## 2.301 звышнормавых гадзін

(Працоўная сэсія)

Краеўскі і Зільберштэйн працавалі ў пякарні МЦРК № 4. Вельмі часта пасьля скончэньня работы загадчык пякарні прапанаваў ім застацца і працаваць другую зьмену в прычыны тэрміновасьці заказаў. Такім чынам, Краеўскі прапрацаваў звышнормава 115 дзён, або 1725 гадзін, а Зільберштэйн—576 гадзін.

Краеўскі і Зільберштэйн прасілі заплаціць ім за прапрацаваны звышнормава час у падвойным разьмеры, згодна існуючых законаў, але адміністрацыя МЦРК адмовілася і заплаціла ім у арыгінальным разьмеры, як за звычайную працу. Краеўскі і Зільберштэйн засталіся незадаволенымі такім разьлікам і падалі скаргу ў працэсію.

На судзе высьвятлялася, што Краеўскі і Зільберштэйн працавалі з дазвала і з прыказу адміністрацыі. Прычым досыць часта бывалі выпадкі, калі працавалі 8 гадзін, да іх падыходзіў загадчык пякарні і прапанаваў ім заставацца на другую зьмену і працаваць. Такім чынам бывалі дні, калі яны працавалі па 16 гадзін.

Лічачы, што другая зьмена была імі выкананая, як звышнормавая работа, Краеўскі і Зільберштэйн просяць заплаціць ім як за звышнормовую працу: Краеўскаму—316 руб., Зільберштэйну—141 р. 74 к.

Працэсія, разглядзеўшы справу, пастанавіла спагнаць з праўленьня МЦРК у карысьць Краеўскага—316 р. 78 к., Зільберштэйна—141 р. 74 к.

Апрача гэтага, працэсія пастанавіла перадаць справу пракуратуры для прыцягненьня да крымінальнае адказнасьці адміністрацыі пякарні, якая дапушчала звышнормавыя работы ў дзень зьмены без дазволу аддзела працы.

А.

# МЕНСК

## Пад суд за скажэньне каапэрацыйнай лініі

### Паведамленьне ЦКК КП(б)Бел.

У зьвязку з зьмешчанымі фэльетонамі ў газэтах „Зьвязда", ад 28-XII-27 г., „Рабочы", ад 25-XII, і інш. газэтах аб дзейнасьці Бабруйскага саматуж. прамсаюзу (скажэньні ім каапэрацыйнай лініі) ЦКК КП(б)Бел. па высьвятленьні гэтага пытаньня пастанавіла перадаць справу пракуратуры для прыцягненьня вінаватых да адказнасьці.

Пракурору Рэспублікі даручана паскорыць прахаджэньне справы па судова-сьледчых органах.

ЦКК КП(б)Б даручана ўпоўнаважаному РСІ на Бабруйскай акрузе паставіць пытаньне аб прыцягненьні да адказнасьці рэвізійную камісію акр. прам. саюзу за пацьверджаньне матар'ялаў праўленьня, якія не адпавядаюць сапраўднасьці.

## Пабудова трамваю ў Менску

1-га лютага ў акрвыканкоме адбылася тэхнічная нарада, дзе абмяркоўвалася пытаньне аб набудове ў Менску трамваю. З дакладам аб праекце набудовы трамваю выступілі прадстаўнікі ПрамБТУ інжынэры Германовіч і Розэнфэльд, якія прыехалі з Масквы. Эскізы праекту ПрамБТУ нарадаю зацьверджаны.

У дакладзе прыехаўшыя інжынэры асьвятлялі асноўныя напрамкі лініі трамваю, маршруты і г. д. Па праекце прадугледжана тры маршруты, якія будуць набудаваны ў дзьве чаргі. Адна чарга будзе набудавана ў бліжэйшы час, а другая—праз некалькі год. Набудове трамваю паводле праекту будзе каштаваць у першую чаргу—1.800.000 р. і ў другую чаргу—500.000 руб. Набудове трамваю будзе звачна перашкаджаць цэнтральная сетка, якая будзе заключана ў зямлю.

Нарада зацьвердзіла пачатковыя і канчатковыя пункты трамвайных ліній. З прычыны вузкасьці Ленінскае вуліцы і вул. Энгельса, трамвай пойдзе па вул. Валадарскага, або Урыцкага, па Рэспубліканскай, Рэвалюцыйнай на пляц Волі.

Трамвайны парк прадугледжана набудаваць або на Конным пляцы, або на пляцы Троцкага.

Падрыхтоўчая работа на набудове трамваю пачнецца ўлетку гэтага году. На падрыхтоўчыя работы адпушчана 150.000 руб.

## Пяцігадовы юбілей кас ашчаднасьці

У сярэдзіне лютага мінае пяць год існаваньня кас ашчаднасьці. Зараз у Беларусі адкрыта 470 кас ашчаднасьці, уклады якіх на 1 студзеня г. г. складаюць 4.200.000 рублёў.

## Нацкамісія ЦВК БССР—Украінскай Акадэміі Навук

Пры Украінскай Акадэміі Навук арганізавалася катэдра яўрэйскай культуры.

У зьвязку з гэтым нацкамісія ЦВК БССР адправіла Украінскай Акадэміі Навук наступную тэлеграму:

„Заснаваньне катэдры яўрэйскае культуры яры Украінскай Акадэміі Навук—ёсьць буйны крок уперад ня толькі ў працоўных УССР, але і ўсяго нашага Саюзу ў справе будаўніцтва пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі пралетарскай культуры.

Нацыянальная камісія ЦВК БССР горача вітае адкрыцьцё катэдры яўрэйскай культуры і жадае ёй плённай будаўнічай працы".

## Пуск махорачнае фабрыкі

Праз некалькі дзён будзе пушчана ў ход Менская махорачная фабрыка Менсельпраму. Фабрыка пераабсталявана навава. Атрыманы вольнавы варштаты. На фабрыцы будзе занята 60 чал. рабочых. Выпрацоўка фабрыкі—400 скрынак махоркі ў дзень. Пераабсталяваньне фабрыкі каштавала 20 тысяч рублёў.

## Літаратура на беларускай мове да 10-годзьдзя Чырвонай арміі

Да юбілею 10-годзьдзя Чырвонае арміі, згодна пастановы цэнтральнае камісіі па правядзеньні сьвяткаваньня юбілею, выдаецца на беларускай мове наступная літаратура: брашура Харытонава „10 гадоў Чырвонай арміі", у якой аўтар у папулярнай форме выкладае ўсю гісторыю Чырвонае арміі за 10 год, а таксама і гісторыю яе на Беларусі, растлумачвае структуру Чырвонай арміі і адрозьненьне апошняе ад армій буржуазных.

Таксама выходзіць на беларускай мове прамова т. Варашылава на XV зьезьдзе УсеКП(б).

## Паляпшэньне вадазабесьпячэньня гораду Менску

У Менск прыехалі запрошаныя Эльводам геалёгі Ляшчанка і Гартэль—прадстаўнікі Маскоўскага аддзяленьня геалёгічнага камітэту для складаньня дагавору на дасьледчыя работы па паляпшэньні вадазабесьпячэньня г. Менску. Прадугледжваецца высьвідраваць тры артэзіянскія прабіны каля 300 мэтраў глыбіні кожнае. Гэтыя прабіны дадуць магчымасьць навукова дасьледаваць геалёгічную набудову вапнякоў, з якіх зараз Менск забясьпечваецца вадою. Работа будзе выканана ў працягу аднаго году.

# «СПОРТ»

## Нарвэзская спартакіяда

Па скончэньні Усесаюзнага зімовага сьвята лепшыя фізкультурнікі СССР паедуць у Нарвэгію для ўдзелу ў першай нарвэзкай спартакіядзе.

Траба сказаць, што пытаньне ў Нарвэгіі ставіт рабочага спартыўнага руху ўжо высьвятлена. Ня мала патрачана сіл і энэргіі на тое, каб арганізаваць зімовую рабочую спартакіяду.

Буржуазныя спартыўныя арганізацыі назайміалі ўсе клюбы, пляцоўкі і інш. Ня было зіводнага вольнага памяшканьня для спаборніцтваў на баранцьбе і боксе.

Пасьля доўгіх перагавораў удалося дабіцца ад рабочага клюбу, які выдзяляецца прыкладнікам [illegible] 5.000 кам. і месца для зімнага прабегу.

Для правядзеньня гэтага сьвята быў праведзен „10-кропны збор". Гэтыя спаборніцтвы зьявяцца для рабочых Нарвэгіі сапраўдным сьвяткаваньнем. Калі толькі гэта сьвята пройдзе з посьпехам, то спартыўная захопіць пачатак рабочаму спартыўному руху ў Нарвэгіі.

Спартакіяда пачнецца ў лютым м-цы, на якую запрошаны рабочыя спартыўныя арганізацыі ўсяго сьвету.

### Нам. старшыні ВСФКБ выехаў у Нарвэгію

Намесьнік старшыні ВСФКБ т. Леў выехаў у Нарвэгію для ўдзелу ў зімовым рабочым спартыўным сьвяце.

## Звальненьне са службы і аддача пад суд працаўнікоў МЦРК

За правоз з Крыму 4-х мяшкоў мукі за лік МЦРК і захоўваньне гэтага праступку, прэзыдыум праўленьня МЦРК пастанавіў зволіць з працы 2 работнікаў фруктовага складу Лагуна і Шэндэрава.

— За злоўжываньне службай у куплі 5 пуд. круп і продажу яе па вышэйшай цане зьмешчан з пасады загадчык ларка № 22 і пераведзен у прадаўцы з выгаварам.

— У некаторых магазынах высьветлены недахопы. Прэзыдыум МЦРК пастанавіў справу перадаць аб гэтым сьледчым органам для высьвятленьня вінаватых і прыцягненьня іх да адказнасьці.

## Тав. Галадзед вярнуўся ў Менск

2-га лютага вярнуўся з паездкі ў Маскву старшыня СНК БССР т. Галадзед.

## Новы склад акрсуду

На апошнім пасяджэньні акрвыканкому быў абраны склад акруговага суду. Старшынёю суду абраны т. Карпачоў, намесьнікам на крымінальным аддзеле т. Жылінскі, на грамадзянскім—т. Кіш. У якасьці членаў акрсуду абраны т.т. Пякура, Грамыка, Грыгарчук, Левін і Шыфрын.

ПРЫЕЗД ДАНЦЫГСКАГА КАМЭРСАНТА. У Менск прыехаў прадстаўнік данцыгскай лясной фірмы гр-н Фішэр для вядзеньня перамоў аб заключэньні зьдзелкі на лясныя матар'ялы.

## Здарэньні

— Затрыманьне афэрыстых. Крымінальны вышук затрымаў вядомых афэрыстых М. Рудыцэра, У. Казарынавіча і С. Бельскага, якія шляхам афэры забралі ў Койданаве ў селяніна Скарабагатага каня. Конь адабраны ад афэрыстых і вернуты пацярпеўшаму.

— Загадчык гаспадарчай—растратчык. У Смалявіцкай больніцы выкрыта недастача розлай бялізны. Растрату зрабіў загадчык гаспадарчай больніцы Т. Кашэль, які прыцягваецца да адказнасьці.

## Яўка беспрацоўных разумовай працы

З 6 па 18 лютага па сэкцыі разумовай працы будзе праводзіцца яўка для беспрацоўных, якія знаходзяцца на вучоце сэкцыі, паводле раскладу, які вывешан у памяшканьні Біржы працы. Пры яўцы неабходна мець ніжэйку на атрыманьне запамогі. Тыя, якія ня зьявяцца, будуць зьняты з працы.

## На 12-га лютага г. г. склікаецца 4-ты Усебеларускі зьезд сэкцыі працаўніковаў друку з наступнаю абвестаю дня:

1. Бліжэйшыя задачы друку (дакл. сакратар ЦК КП(б)Б—т. Кнорын).
2. Даклад Камітэту па справах друку (дакл. т. Шыпіла).
3. Справаздача ЦБ СПД СССР.
4. Справаздача ЦБ СПД Бел. (дакл. тав. Шукевіч-Трацьцякоў).
5. Выбары Цэнтральнага Бюро СПД Бел.
6. Выбары дэлегатаў на VI-ты Усесаюзны зьезд. СПД.

Зьезд пачнецца а 10 гадз. раніцы ў памяшк. клюбу друкароў (Ленінская вул., 13).

Старшыня ЦБ СПД Бел.—Шукевіч-Трацьцякоў.—

## ДА ЎВАГІ РАБКОРАЎ г. МЕНСКУ.

### У НЯДЗЕЛЮ НАРАДА РАБКОРАЎСКАГА АКТЫВУ.

**У нядзелю 5-га лютага, а 5-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні рэдакцыі газ. „Зьвязда" (Савецкая, 63, 3-ці паверх) адбудзецца нарада рабкораўскага актыву г. Менску.**

**На абвестцы дня—даклад тав. ПРАЎДЗІНА аб далейшай працы і задачах рабкораўскіх гурткоў.**

**Рабселькораўскі аддзел.**

## Да ўвагі рэдкалегій насьценгазэт і рабкораўскіх гурткоў

Рэдакцыя газэты «Зьвязда», улічваючы ўсё яшчэ недастатковую моцную сувязь з рэдкалегіямі насьценгазэт і рабселькораўскімі гурткамі, узмацніла свой рабселькораўскі аддзел новымі работнікамі і намеціла плян лепшага абслугоўваньня рабселькораўскіх ячэек.

Рэдакцыя паведамляе ўсе рэдкалегіі насьценгазэт, што яна, па першым патрабаваньні рэдкалегіі, камандыруе прадстаўніка рэдакцыі з дакладам на тэму аб рабселькораўскай працы.

РЭДАКЦЫЯ

# Бібліяграфія

## МАЛАДНЯК

### Літ.-мастацкая і грамадзка-палітычная часопісь ЦБ „Маладняка"

Вышаў нумар пёршы часопісі „Маладняк" у выданьні ЦК ЛКСМБ і „Чырвонай Зьмены", вышаў у новай вопратцы— вокладцы, прыгожай, добра выкананай. Цікаўлюся зьместам. Разгортваючы заўважыў дзьве дадатныя рэчы—проза значна выпісула вершы і яшчэ—увесь нумар наладжаны сіламі самога „Маладняка".

З вялікім задаваленьнем перачытаў апавяданьне „Зьмітрок" С. Хурсіка. Напісана проста, а разам чуецца пяро ўзрастаючага мастака.

Ціхая аповесьць гэроя Зьмітрука аб змаганьні з старым бытам, з дзікім, зачарсьцьвелым бацькам, эпізод з грамадзянскае вайны, дзе мы бачым Зьмітрука сапраўдным гэроем і разам—салдатам рэвалюцыі, яго вялікая драма з-за Настулькі—усё гэта падана добра на агульным фоне летняе васковае прыроды.

Ня менш цікава і апавяданьне Р. Мурашкі—прыгодніцкага жанру „Прыгранічны манастыр". Сюжэт узяты з жыцьця нашых вартаўнікоў—асаблівых у прыгранічнай паласе. І камсамолец і дарослы з задавальненьнем прачытае гэта апавяданьне.

Неяк не здавальняе мяне „Дзікі сьмех" (вершы ў прозе) Паўлюка Труса. Добрая, стыльная мова, але самая форма наўпол-містычная, дый сюжэт пяшчаснай прастытуткі з дочак загінутага ў рэвалюцыі паменшчыка досыць закоўвае.

Далей ідзе „Кнак" П. Галавача. Заўважваю дасягненьні ў мове аўтара—больш жывая, як у мінулых творах. Агогул жыцьцё малюнак з васковага боку, тэма—наўдалае сваталтво.

Вершы, зьмешчаныя—слабей кроме. Новыя імёны—Пюрыс, Шаўрук, Мікуліч. Робіць добрае ўражаньне верш Наці Маркавай, „Восеньню мітаюць вочы" і „Паўстаньне вершаў" Шушкевіча.

Крытычны нарыс „Па шляхох беларускай пралетарскай літаратуры" М. Аляхновіча гаворыць аб тым, што Маладняк у сваіх шэрагах пачынае выхоўваць і пралетарскіх крытыкаў. А тар сьмела стаў на пазыцыі Бацьмы тым змаганьні на літаратурным фронце, якое ідзе як у РСФСР, так і ў нацыянальных рэспубліках.

Нарыс М. Касьяновіча аб мастацтве нашых суседзяй Латвіі, Эстоніі і Літвы, рэч вельмі патрэбная, заканчвае нарыс нумар.

Увесь нумар сьведчыць аб тым, што Маладняк ня спыняецца на шляху паглыбленьня працы—у залучаньні вынікі гэтай працы, як адносна формы, так і зьместу.

Гэты нумар часопісі знойдзе свайго чытача.

А. Садовіч.

## Паведамленьні

— У суботу, 4-га лютага, а 7 гадзіне ўвечары, у цэнтральным гарадзкім агітпункце адбудзецца канферэнцыя сакратароў ячэек КП(б)Б па партбудаўніцтве пад кіраўніцтвам тав. Аўчынькіна.

— У пятніцу, 3-га лютага, а 7-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні клюбу К. Маркса, у малой залі, адбудзецца нарада прафэсыцы пры дэлегацкіх сходах.

Яўка ўсіх дэлегатак членаў сэкцыі абавязкова.

— У пятніцу, 3 лютага, а 6-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні Гаррайкому КП(б)Б адбудзецца сход сакратароў ячэек Гаррайёну.

З прычыны важнасьці пытаньня ўсе сакратароў ячэек абавязкова.

Адказны рэдактар Ян АСЬМОЎ

# ТЭАТР, КІНО

Дзяржаўны Яўрэйскі ТЭАТР БССР — ПЯТНІЦА, 3 ЛЮТАГА „БОТВІН", усе білеты праданы.

Беларускі Другі Дзяржаўны тэатр — НЯДЗЕЛЯ, 5 ЛЮТАГА „Сон у летнюю ноч", камэдыя ў 3-х дзеях. Паказ для рабочае моладзі з уступным словам. ПАЧАТАК а 8 в. вал.

Кіно-тэатр „Культура" — Грандыёзны мастацкі фільм „КТО ТЫ ТАКОЙ". Анонс! «ИЗ ПОД СВОДОВ МЕЧЕТИ».

КІНО „Чырвоная Зорка". — З прычыны небывалага грандыёзнага посьпеху ПРАДОЎЖАНЫ ЯШЧЭ на 1 ТЫДЗЕНЬ сусьветны фільм „ВАРЬЕТЭ", трагедыя ў 8 част. з удзел. Эміля Янінгса. Толькі 4 дні: 2, 3, 4 і 5 лютага.

КІНО „Пралетарыяк". — ВЫДАТНЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ „ЗАРЭ" ДРАМА Ў 7-МІ ЧАСТКАХ. Зьвы праграмы: ХРОНІКА СОВІЦКАГА 2—III.

КІНО „ПРАЛЕТАРЫ". — „Шестая часть мира". Пачатак сеансаў а 6, 7 і 9 гад., 9 і 10 з п. гадз. увечары. Каса адчыняе ад 6 гадз.


ПАСЬПЯШЭЦЕ ПАДПІСАЦЦА!

на ЛЮТЫ м-ц

ПРЫЁМ ПАДПІСКІ НА ГАЗЭТУ ЗЬВЯЗДА ПРАДАЎЖАЕЦЦА.

Не пасьпеўшыя падпісацца могуць адначаць падпіску сёньня-ж ад 9—3 г. у канторы газэты (Савецк., 63, 3-ці паверх)

ПАСЬПЯШЭЦЕ ПАДПІСАЦЦА!

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2-ое гадзіны дня.

Кошт абвесткі аб сказаньні шлюбу 3 р. | Кошт публікацыі аб згубе дакумэнтаў 50 кап.

ПОДПИСЫВАЙТЕСЬ на ТОРГОВО-ПРОМЫШЛЕННУЮ ГАЗЕТУ

1 год—14 р.; 1/2 года—7 р. 50 к.; 3 мес.—3 р. 75 к.; 1 мес.—1 р. 25 к.

МОСКВА, Пушечная (б. Софийка), д. 10.

Приобретайте билеты правительственной 2-й вещевой лотереи Детпомиссии при ВЦИК'е.

Главные выигрыши в 5.000 и 2.500 р.

ОПРЕДЕЛЯЮТСЯ САМИМ ВЫИГРАВШИМ.

Лицо выигравшее один из двух главных выигрышей, по своему желанию, в пределах стоимости выигрыша, выбирает предмет, вещь, дом или квартиру в любой местности СССР, хозяйкой и свободной продаже товар или строение, что приобретается по указанию выигравшего Детпомиссией и передается последнему.

В числе выигрышей:

Новый заграничный автомобиль.
Слитков серебра-самородка весом в 25 фунт.
Слитков серебра-самородка весом в 12 с пол. фун.
Серебряные самовар в подносе 84°, весом в 5.098 гр. стоимостью 500 руб.
Большой серебряный поднос с гербом старой Москвы 84°, вес 6.695 гр. в 500 рублей.
Серебряные супник и поднос, работы старых мастеров, вес 5.363 гр. в 500 р.
Серебряный кофейный прибор 88°, вес 3.758 гр. в 400 р.
Шкатулка александрового дерева, кована серебром, стоимостью 400 р.
20 велосипедов последнего выпуска германской фирмы „Опель".
72 предмета столового серебра.
2 серебряных блюда 91°, художественной работы, вес 4.190 гр. стоимостью 400 рублей.
2 серебряных блюда 91°, художественной работы, весом 3.150 гр. стоимостью 300 рублей.
2 полные 4-ламповые радио-установки с громкоговорителями.
10 мест на курорт (выигравший указывает подходящее для себя время и желаемый курорт—где и представляется ему месячное пребывание с полным пансионом).
650 заграничных будильников, 1.600 заграничных карманных часов, 2.000 золотых колец, колец, брошек, серег, золотые портсигары и часы, серебряная посуда, кубки, 1.000 отрезов на пальто, костюмы, платья, белье, несколько тысяч практических хозяйственных вещей, керосиновые кухни, примуса, самовары, охотничьи ружья, спорт. принадлежности, мебель, картины, ковры, фарфор и т. д.

Всего 10.000 выигрышей.

РОЗЫГРЫШ ЛОТЕРЕИ СОСТОИТСЯ В МОСКВЕ 1-го АВГУСТА 1928 ГОДА.

ЦЕНА БИЛЕТА 50 КОПЕЕК.

БИЛЕТЫ ПРОДАЮТСЯ ПОВСЕМЕСТНО:

в Детпомиссиях, об-вах и ячейках „Друг Детей", в конторах и отделениях Госбанка, об-вах взаимного кредита, сберкассах и почтовых отделениях.

Во всех вышеперечисленных учреждениях можно будет получить таблицы и все подробные справки о результатах розыгрыша.

Подписчики и читатели „Зьвязды", выписывающие билеты непосредственно из Детпомиссии, пользуются перед прочими покупателями следующими льготами:

1) Потерянные билеты высылаются им в любом количестве по получении стоимости таковых (можно гербовыми и почтовыми марками). Пересылка за счет Детпомиссии.

2) Подробный список выигрышей 10.000 предметов и тираж. таблица по окончании розыгрыша высылаются им бесплатно.

3) Выигранная вещь высылается за счет Детпомиссии.

Детпомиссия ВЦИК:—МОСКВА, Центр, Моснворецкая-Набережная, дом № 1-13.

ЗАОЧНЫЕ ПРОМЫШЛЕННО-ЭКОНОМИЧЕСКИЕ КУРСЫ „ПОЛИГЛОТ"

(Основ. в 1917 г.)

состоящие в ведении С.-К. Крайоно.

ПРЕДМЕТЫ ПРЕПОДАВАНИЯ:

бухгалтерия, коммерческ. счисл., торг. корреспонд., делопроизводство, исправление почерка, техн.-худож. черчение, машиностроительное черчение, рисование, стенография и конструкт. (дефинитиф).

Занятия посредством переписки по почте специально составленными лекциями, ВПОЛНЕ ЗАМЕНЯЮЩИМИ УСТНОЕ ПРЕПОДАВАНИЕ. По окончании курса учащиеся подвергаются испытанию в специальн. квалифик. комиссии и получают соответствующее СВИДЕТЕЛЬСТВО.

На 1-е ноября 1927 г. на курсах состоит свыше 15.000 учащихся.

Плата помесячно от 1 до 3 рублей.

Требуйте бесплатно проспекты, программы и условия.

Адрес: Ростов на Дону „ПОЛИГЛОТ".

Гэтым паведамляецца, што згодна пастаноў агульных сходаў, ЖАКТ'ы № 15 і № 18 зьліваюцца ў адзін ЖАКТ, зарэгістраваны ў Б. Ж. С. пад № 18. Усе абавязацельствы ЖАКТ'аў №№ 15 і 18 пераходзяць да ўзбуйнёнага ЖАКТ'у № 18. Часовае праўленьне ЖАКТ'у № 18

ПА СПРАВАХ падпіскі і абвестак звяцеца па тэлефону 7-81.

ПРАДАЮЦЦА старыя газэты, ГАЗЭТНЫ ЗРЫЎ. Зварочацца ў кантору газэты „Зьвязда" з 9—3 гадз.


## Згубленыя і ўкрадзеныя

### наступныя дакумэнты лічыць несапраўднымі:

Камсанольскі біл. № 1296 Лотвіна А. М., выдан. менакругкомам ЛКСМБ. 1458

Сяброўскі біл. Янусевіча В. К., выдан. саюзам гархару. 1459

2 конскія карткі Юхновіча У. П., выд. Сенніцкім РВК. 1460

Асабовая картка Юхновіча У. П., выд. Сенніцкім РВК. 1461

Падаходны ліст Юхновіча У. П. 1462

Талонная кн. Юхновіча У. П. 1464

Пенсійная кн. Чэрчеса Ш. Ш., выд. Менстрахкасай. 1465

Каапэрат. кн. Шымко М. М., выдан. МЦРК. 1466

Пашпарт Левінсона Л. М., выд. Менскім. 1467

Друкарня газэты «Зьвязда»—Менск. Менск, Савецкая № 300